ЧАЦЬВЕР, 24 ЖНІЎНЯ 1933 г. № 195.

Адрас рэдакцыі і канторы: г. Віцебск, плац Волі, Палац працы, трэці паверх.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА 2 р. у мес.
Цана асобн. нумару 8 кап.

Тэлефоны рэдакцыі: Сэкратарыят—1-73, нам. рэдактара, партыйны і нацыянальна-культурнага будаўніцтва сэктары—4-76, сэктары прамысловы, сельска-гас падарчы—72, рабочага снабжэньня і кааперацыі, савецкага будаўніцтва—6-15, навучэльна рэдакцыя—4-36.

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ.

СЕНЬНЯ Ў НУМАРЫ:

Прамова сэкратара ЦК КП(б)Б тав. В. Ю. Жаброўскага на ўсебеларускай нарадзе загадчыкаў раённых аддзелаў народнай асьветы і прадстаўнікоў школ, тэхнікумаў і ВНУ.

Проці ракордсменства, за якасьць і бальшавіцкія тэмпы ўборкі і абмалоту.

ЗА ГРАНІЦАЙ. Новыя спробы сарваць перагаворы аб КУЧ.

Справа агляду работы жактаў—справа усёй пралетарскай грамадзкасьці Віцебска.

«Правда» у перадавым артыкуле спэцыяльна па пытаньні аб жыльлі для рабочых піша:

Дзе, калі, у якой яшчэ краіне, апрача нашай савецкай, такімі бурнымі тэмпамі разьвіваецца жыльлёвае будаўніцтва і пабудова новых гарадоў?.. Але, мы можам і павінны зрабіць яшчэ большае для паляпшэньня бытавых умоў рабочых. У чым адчуваюць найбольшую патрэбу многія рабочыя сёньня? У КВАТЭРЫ, У ДОБРЫМ, УДОБНЫМ ЖЫЛЬЛІ.

Вядома, што аднэй з асноўных прычын вялікай цякучасьці рабочай сілы зьяўляецца недахоп жыльля. Правадыр нашай партыі тав. СТАЛІН, які выключную ўвагу ўдзяляе пытаньням паляпшэньня бытавых умоў рабочых, яшчэ 2 гады назад у сваёй гістарычнай прамове «Новая абстаноўка, новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва» гаварыў: «ДЛЯ ЗАМАЦАВАНЬНЯ РАБОЧЫХ ЗА ПРАДПРЫЕМСТВАМ НЕАБХОДНА ЯШЧЭ ДАЛЕЙШАЕ ПАЛЯПШЭНЬНЕ СНАБЖЭНЬНЯ І ЖЫЛЬЛЁВЫХ УМОЎ РАБОЧЫХ». Т. СТАЛІН назваў гнілымі і наскрозь пратухлымі элемэнтамі тых, хто ўцяшаецца спасылкамі на мінулае: раней моў жыльля было менш, чым цяпер, з прычыны чаго можна супакоіцца на дасягнутых рэзультатах.

Той, хто яшчэ зараз працягвае спасылацца на мінулае, проста сьляпы. Ён ня бачыць, што «рабочы зараз—ня тое, што раней. Цяперашні рабочы, наш савецкі рабочы, хоча жыць з пакрыцьцём усіх сваіх матар'яльных і культурных запатрабаваньняў і ў сэнсе харчовага снабжэньня, і ў сэнсе жыльля і ў сэнсе забесьпячэньня культурных і ўсякіх іншых патрабаваньняў. Ён мае на гэта права і мы абавязаны забясьпечыць яму гэтыя ўмовы». (І. СТАЛІН).

„У гэтым годзе ў нас вялікі ўраджай. Ідзе ўборка. Партыя дабіваецца, што ўраджай будзе сабраны з меншымі стратамі, чым у мінулыя гады—хлеб будзе. Значна больш, чым у мінулым годзе будзе гародніны і нямалая дапамога ў гэтых адносінах—індывідуальныя гароды рабочых. Да ўсяго гэтага ДОБРАЕ ЖЫЛЬЛЁ,—і дзесяткі тысяч рабочых будуць адчуваць новае значнае задавальненьне сваіх узросшых запатрабаваньняў! Хто не разумее, што зараз больш, чым калі-б та ні было патрабуецца рушыць уперад жыльлёвае будаўніцтва, той нічога не разумее ў працэсах, што адбываюцца ў нашай краіне, той ня здольны змагацца за стварэньне сталых кадраў, бяз чаго нямысьліма ажыцьцяўленьне важнейшага лёзунгу—асваеньне новай тэхнікі".

У нас па Віцебску налічваецца 35 жактаў. Жакты маюць 1330 дамоў, з плошчаю 187825 кв. мэтраў. Гэтыя адны лічбы з усёй відавочнасьцю кажуць нам аб тым, якое аграмаднае значэньне павінны адыгрываць жакты ў справе паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочых і працоўных.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб становішчы віцебскай партыйнай арганізацыі, адзначыў адсутнасьць сур'ёзных, канкрэтных адносін мінулага кіраўніцтва гаркому партыі і гарсавета, да пытаньняў становішча культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых. І ў пытаньнях барацьбы за паляпшэньне культурна-бытавога абслугоўваньня, значную ролю закліканы адыграць жакты. Між тым, работа па кіраўніцтву жактамі і зараз, да апошняга часу забыты і ў значнай меры бяспрытульны, закінуты вучастак работы.

Абноўленае кіраўніцтва гарадзкога Савета зараз пачала зьвяртаць сур'ёзную ўвагу, дапамогу і кіраўніцтва работаю жактаў. У парадку ўдзела газэты „Віцебскі пралетары" у пачатай гарсаветам надзвычайна важнай работы па аздараўленьню і рашучаму падцягваньню работы жактаў, мы абвяшчаем масавы агляд работы жактаў на старонках нашай газэты.

АГЛЯД РАБОТЫ ЖАКТАЎ ПАЧАЎСЯ.

Наша задача заключаецца ў тым, каб пасьлядоўна, цьвёрда ажыцьцяўляць пралетарскую, клясавую лінію ў жыльлёвай каапэрацыі, пралетарскую клясавую лінію ва ўсёй рабоце жактаў.

Лепшую кватэру трэба даваць рабочаму ўдарніку, змагару барацьбы за прамфінплян—вось першачарговы абавязак кожнага жакта. А вось, у жакце № 10, рабочы—друкар ЗАМАЛІН з сям'ёй у 6 чалавек займае плошчу ў 5×5 кв. мэтраў, пры тым, кватэра вельмі дрэнная, радам з імі ў добрай кватэры, якая займае 10 квадратных мэтраў жыве гр-ка РАМ—жонка высланага з Віцебску контррэвалюцыянэра. У жакце № 2 царкоўны стараста ЕМЕЛЬЯНАЎ са сваёй сям'ёй займае тры пакоі, а герой пяцігодкі КАЖАМЯЧАНКА, РУНІН—многасямейныя, жывуць у сырым памяшканьні.

Гэтыя жывыя прыклады—ёсьць прыклады прамога скажэньня і грубага парушэньня клясавай, пралетарскай лініі ў рабоце гэтых жактаў, (старшыні жактаў №№ 10 і 2 СЯЛЮЦІН і ШАТКАР). Асноўная задача агляду — разгарнуць шырокую, сьмелую пралетарскую самакрытыку работы жактаў, сьмела і вычэрпальна выявіць факты скажэньняў клясавай лініі ў рабоце асобных жактаў, выявіць недахопы, выявіць па імёнах і прозьвішчах канкрэтных носьбітаў зла, а таксама разам з гэтым выявіць і разгорнута паказаць прыклады лепшай работы, якія павінны быць перанесены ва ўсе жакты.

„Няма больш пачэснай задачы для бальшавіка-рэвалюцыянэра, які змагаўся дзесяткі год за справу рабочай клясы, як справа дапамогі рабочым, справа паляпшэньня становішча рабочых" (Л. М. КАГАНОВІЧ).

Адна з асноўных задач нашага агляду—гэта тое, каб у час ХОДУ агляду дабіцца рашучага падцягваньня работы жактаў, дабіцца каб жакты сваечасова і добраякасна вялі рамонт дамоў, змагаліся за захаваньне чыстаты і парадку ў жактаўскіх дамох, у кожным жактаўскім двары, у кожнай паасобку кватэры і пакоі. Агляд павінен дапамагчы ўзмацніць самую рашучую барацьбу з безгаспадарчасьцю, расхлябанасьцю, разгільдзяйствам, сямейнасьцю, фактамі самаснабжэньня, кругавой парукі, замкнутасьці, цэхаўшчыны. Трэба безадкладна дабіцца рашучага крутога пералому ў рабоце кожнага жакта.

Трэба перабудаваць работу жактаў, арганізаваць іх работу па-новаму!

І тут патрабуецца вялікая дапамога ад усіх прафсаюзных, гаспадарчых і савецкіх арганізацый, а таксама ад камсамольскай арганізацыі. А трэба з усёй рашучасьцю сказаць, што ГАРПРАФСАВЕТ ПАКУЛЬ ШТО ФАКТЫЧНА СТАІЦЬ У БАКУ АД ПРАКТЫЧНАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ПАЛЯПШЭНЬНЕ РАБОТЫ ЖАКТАЎ. Фармальна, на паперы, шэраг прадпрыемстваў Віцебску шэфствуюць над жактамі. Між тым, пакуль што, падкрэсьліваем, гэта шэфства толькі дэкларацыйнае: ніякай дапамогі фабзаўкомы не аказваюць жактам. Мы чакаем ад прафсаюзных арганізацый жывых бальшавіцкіх спраў, не дэкларацыйных пастаноў, а КАНКРЭТНАЙ дапамогі жактам, АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ на справе кожнадзённага, дзелавога шэфства прадпрыемстваў Віцебску над жактам. Чакаюць дапамогі жакты яшчэ ад камсамолу і груп „лёгкай кавалерыі".

Вялікія і адказныя абавязкі ўскладваюцца на наш нізавы друк. Кожная фабрычная шматтыражка, кожная фабрычная насьценная газэта павінны ўключыцца ў агляд, узяць пад свой непасрэдны нагляд работу падшэфнага жакта, ускрыць недахопы, скажэньні клясавай лініі, выявіць і разгорнута паказаць станоўчы вопыт работы, дапамагчы жактам у іх рабоце. У жактаў трэба стварыць сетку баявых насьценных газэт, пры абавязковай умове забесьпячэньня партыйнага кіраўніцтва імі.

АГЛЯД ЖАКТАЎ ПАВІНЕН ПЕРАТВАРЫЦЦА Ў СПРАВУ ЎСЁЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ ВІЦЕБСКУ.

Навядзем бальшавіцкі парадак у рабоце жактаў, забясьпечым безадкладную, крутую і рашучую перабудову ўсёй іх работы, забясьпечым моцнае пралетарскае кіраўніцтва, моцны пралетарскі ўплыў ва ўсёй рабоце кожнага з жактаў.

На аснове масава-растлумачальнай работы забясьпечым поўнае выкананьне працоўнымі АДНААСОБНІКАМІ збожжапаставак.

Кожны сельсавет, кожная ячэйка, увесь калясны актыў павінны разгарнуць растлумачальна-масавую арганізацыйную работу сярод працоўных аднаасобнікаў, калясьнікаў, мабілізуючы іх на выкананьне збожжапаставак выключна добраякасным збожжам. Член сельсавету і ўлаўнаважаны па дзесяцідворцы павінны стаць цэнтральнай фігурай па арганізацыі збожжапаставак у аднаасобным сэктары. Член сельсавету і ўлаўнаважаны па дзесяцідворцы нясе ў першую чаргу, разам з старшынёй сельсавета, непасрэдную адказнасьць за свой пункт, за выкананьне і якасьць збожжапаставак аднаасобнікамі гэтага пункту.

Мабілізуючы ўсе сілы, разгарнуўшы шырокую масавую і арганізацыйную работу сярод працоўных аднаасобнікаў і калясьнікаў, наносячы руйнуючы ўдар па спробах кулацкага сабатажу—забясьпечым поўнае выкананьне пляну збожжапаставак высокаякасным збожжам.

У Старым Сяле не вядуць вучоту збожжапаставак.

Вучот ходу збожжапаставак па аднаасобным сэктары ў Старасельскім сельсавеце заблытан. Прысланы гарсаветам спэцыяльны вучотчык БАЛВАНЕНКА бязьдзейнічае.

У сельсавеце нельга даведацца, якія аднаасобнікі здалі азімае жыта ў лік збожжапаставак, а якія ня здалі.

АДНААСОБНІКІ ВЁСКІ МІГАВА Ў КОЛЬКАСЬЦІ 14 ДВАРОЎ, ЗУСІМ ЯШЧЭ НЕ ПРЫСТУПАЛІ ДА ЗБОЖЖАПАСТАВАК. Прымацаваны да гэтага пункту настаўнік ШЫМАНСКІ і брыгадзір ГК ВЯРОЎКІН бязьдзейнічаюць. Ёсьць выпадкі прамога сабатажу в боку паасобных членаў сельсавету. Так, член сельсавету ШЫЛІН з вёскі Федзіна сам ня здаў яшчэ ні воднага кілё збожжа. Гледачы на яго, не здаюць збожжа і іншыя аднаасобнікі яго пункту.

Прычыны невыкананьня пляну збожжапаставак па гэтых вёсках тлумачацца толькі тым, што прымацаваныя таварышы не разгарнулі палітыка-масавую работу сярод аднаасобнікаў, не арганізавалі іх на датэрміновае выкананьне пляну збожжапаставак. Гэта падцьвярджае той факт, што там, дзе разгорнута работа з аднаасобнікамі, там збожжапастаўкі выконваюцца актыўна. Так, вёска Чыліна, працоўныя аднаасобнікі АРЦІШЭНКА АНДРЭЙ, ЯСОНАЎ ПАЎЛА поўнасьцю выканалі гадавы плян збожжапаставак жыта і ячменю, выканалі гадавы плян і працоўныя аднаасобнікі в вёскі Куратнікі. Да гэтых вёсак прымацаваны настаўнік ВІХМАН.

Сельсавет, партыйная ячэйка павінны скончыць са сваёй безлабершчынай і безадказнасьцю. Збожжапастаўкі патрэбна АРГАНІЗАВАЦЬ. Жалезны адпор трэба даць, як апартуністычнай стаўды на сманцёк, гэтак і гніла ліберальным адносінам да барацьбы з правямі кулацкага сабатажа збожжапаставак. Кожны брыгадзір в гораду, актывіст з сельсавету, калгасу абавязаны арганізаваць масавую работу сярод аднаасобніка і калгасьніка, мабілізуючы іх на датэрміновае і абавязкова высокаякаснае выкананьне пляну збожжапаставак. Патрэбна таксама неадкладна наладзіць вучот выкананьня пляну збожжапаставак як па аднаасобным сэктары, так па калгасах і калгасьніках.

ГРЫНМАН.

У Віцебскім сельсавеце аднаасобнік ігнаруецца.

З усіх вёсак Віцебскага сельсавету толькі адна вёска Дзейкі разгарнула збожжапастаўкі—плян выкананы на 55 проц. А па астатніх вёсках, справа ў аднаасобным сэктары не арганізавана, ідзе з рук вон дрэнна. Здадзена ўсяго толькі 3,91 цэнтнера азімага жыта. Такім чынам жывеньскі плян пастаўкі азімага жыта дзяржаве па аднаасобным сэктары Віцебскага сельсавету выкананы толькі на 35 проц.

Партыйная ячэйка, упаўнаважаныя гарсавету вельмі мала зварачаюць увагі да працоўных аднаасобнікаў, не арганізуюць іх, не вядуць з імі шырокай масава-растлумачальнай, выхаваўчай работы.

Ігнараваньню аднаасобніка павінен быць пакладзены канец!

КІН.

З фронту уборкі і збожжапаставак.

КІРАЎНІК ТРАКТАРНАГА АТРАДУ КРЫЦКІ НЕ СПРАЎЛЯЕЦЦА З РАБОТАЙ.

У БАРАЎЛЯНСКІМ сельсавеце працуе трактарны атрад Віцебскай МТС па хлебаўборцы ў калгасах. Работа гэтага атраду з рук вон дрэнная.

Калёнаважаты атраду Крыцкі ўвесь час бязьдзейнічае. Бязьдзейнічае і загадчык вытворчым вучасткам Канчэўскі. Увесь трактарны інвэнтар і прычэпныя прылады давёў да самага горшага становішча, інвэнтар валяецца ўсюды на палёх, на дварох, увесь папсаваны, не рамантуецца (у калгасе імя Леніна).

Трактары амаль увесь час стаяць у рамонце. Часта не хапае прычапных частак.

Кіраўнік атраду Крыцкі не спраўляецца са сваёй задачай, не забясьпечвае ў тэрміны ўборку збожжа. Тав. Галавёнку трэба сур'ёзна заняцца работай трактарнага атраду ў Бараўлянскім сельсавеце і вінаватых у зрыве работы прыцягнуць да суровай адказнасьці.

ЯНКА.

Раўняйцеся па калгасьніках калгасу „Прызыў".

16 жніўня заваршыў плян збожжапаставак азімага жыта калгас „Прызыў", Бараўлянскага сельсавету. Выканалі плян збожжапаставак і калгасьнікі па ўсіх збожжавых культурах в сваіх гародаў.

БАГАН.

Здадзена 19,5 цэнтнераў збожжа.

Каапгас «Тулава» у лік збожжапаставак, здаў дзяржаве 19,5 цэнтн. збожжавых культур.

Задача кіраўнікоў усіх каапгасаў неадкладна, зараз-жа, прыступіць да збожжапаставак. Патрэбна, каб нашы каапгасы ў збожжачастаўчай кампаніі пакезалі бальшавіцкі прыклад поўнага і сваячасовага выкананьня збожжапаставак.

Узяць прыклад з каапгасу „Парыская камуна".

Каапгас „Парыская камуна" выканаў плян збожжапаставак па азімым жыце і ячмені. Здадзена 25 цэнтнераў добраякаснага адборнага жыта і адзін цэнтнер ячменю. Каапгас «Парыская камуна» выклікае пасьледаваць яго прыкладу ўсе каапгасы раёну.

ШЭР.

Азімай сяубе—бальшавіцкія тэмпы і высокую якасьць.

Азімая сяўба па раёне разгортваецца яўна нездавальняючымі тэмпамі і па шэрагу месц невысока якасна.

Па даных гарЗА на 20 жніўня, па раёну засеяна толькі 180 га азімага жыта калгасамі, а аднаасобнікі нават і на сёньняшні дзень да сяўбы яшчэ не прыступілі.

Нягледзячы на тое, што тэрміны пасеву азімай пшаніцы праходзяць, ні калгасы, ні аднаасобнікі Віцебскага раёну не засеялі яшчэ ніводнага га, што дасыць моцна пагражае ўраджайнасьці ўкараняемай у гэтым годзе на основе рашэньняў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, пшаніцы.

З месц паступаюць сыгналы аб тым, што ў выніку адсутнасьці дастатковай распараджальнасьці і настойлівасьці з боку сельсаветкіх работнікаў на месцах не хапае мінэральнага ўгнаеньня, што пасеў часта праводзіцца на недастаткова ўгноенай глебе, як у час веснавога севу, ўзначнай частцы месц маецца ўпартае супраціўленьне радавой сяўбе, непадрыхтаванасьць сявярак—недахоп іх.

У гэтым годзе, як ніколі, трэба паставіць на ўсю шыр пытаньне аб правядзеньні самай ВЫСОКАЯКАСНАЙ сяўбы. Для гэтага неабходна, КАБ ЛЕПШАЕ АДБОРНАЕ ЗБОЖЖА ПАЙШЛО НА НАСЕНЬНЕ, КАБ БЫЛА ДАСТАТКОВА ГЛЫБОКАЯ ПАХАТА, ВЫКЛЮЧНА РАДАВЫ СЕЎ, КАБ БЫЛІ ВЫТРЫМАНЫ ТЭРМІНЫ СЯЎБЫ (ПРЫКЛАД БАРАЦЬБЫ ЗА ЯКАСЬЦЬ ПАКАЗВАЕ КАЛГАС ІМЯ МОЛАТАВА, ШУМНЯНСКАГА С/С), БО З ПРАКТЫКІ РАБОТЫ МІНУЛЫХ ГОД МЫ БАЧЫЛІ, ШТО СПАЗЬНЕНЫЯ АЗІМЫЯ ПАСЕВЫ ВЕЛЬМІ МОЦНА АДБІВАЮЦЦА НА ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ ЖЫТА І АСАБЛІВА ПШАНІЦЫ.

Тое, што па раёне яшчэ дагэтуль не засеяна ні воднага га пшаніцы—МОЦНЫ СЫГНАЛ, які абавязвае праўленьні калгасаў, сельскія саветы, гарЗА, МТС зараз-жа прыняць усе захады, каб насеньне пшаніцы было, (а на гэта ёсьць усе магчымасьці, бо ўжо 85% азімай пшаніцы ўбрана) каб яно зараз жа было пратраўлена і ачышчана, і ў самыя бліжэйшыя дні пасеяна. Пасеяць высокаякасна. 900 га азімай пшаніцы і ніводнага га на менш—адна з самых баявых адказных задач у правядзеньні азімай сяўбы.

Праўленьні калгасаў і сельскія саветы, калгасныя партыйныя ячэйкі абавязаны, не губляючы ніводнай мінуты, зараз жа ўзяць такія тэмпы і высокую якасьць уборкі занятых папараў, каб ні ў якім разе не дапусьціць зрыва ўстаноўленага тэрміну азімай сяўбы да і верасьня, каб хутка і добраякасна апрацаваць глебу.

Зусім пагражаючае становішча з работай па забесьпячэньню правядзеньня асеньняй сяўбы ў адна асобным сэктары. Тут зноў паўтараюцца грубейшыя памылкі дапушчаныя ў час веснавой сяўбы. Неабходна сельскім саветам, членам сельсаветаў зараз жа мабілізаваць на основе шырока разгорнутая масавай і арганізацыйнай работы, масы працоўных аднаасобнікаў на паскарэньне тэмпаў і якасьці апрацоўкі глебы і правядзеньня самой сяўбы.

У тэрмін і добра засеяць 12.100 га азіміны, з якіх 900 га пшаніцы—задача выключнай важнасьці, якая патрабуе праўленьня максымуму чоткасьці, на стойлівасьці, апэрацыйнага кіраўніцтва.

Азімай сяўбе—бальшавіцкія тэмпы і самую высокую якасьць.

Засеялі 6 га.

Калгас імя Леніна, Сялюцкага сельсавету, добра падрыхтаваўшыся да азімай сяўбы, на 22 жніўня засеяў 6 га па добра апрацаваных чорных папарах.

СЯЎБА ПРАВОДЗІЦЦА РУЧНЫМ СПОСАБАМ І ТЫМ САМЫМ ІГНАРУЕЦЦА ЎКАЗАНЬНЕ ГАРКОМА І ГАРСАВЕТА АБ ЗАСЕВЕ РАДАВЫМ СПОСАБАМ.

Засеў 24 га калгас скончыць да 1 верасьня.

БОБ.

Распачалі сяўбу з 17 жніўня.

Калгас імя Войкава, Рудніцкага сельсавету азімую сяўбу пачаў з 17 жніўня. Падрыхтавана пад засеў 23 га папару.

РЫЖЫК.

Дзеньнік выязной рэдакцыі

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ў Віцебскім сельсавеце.

20—21 ЖНІЎНЯ.

■ ПА СЕЛЬСАВЕЦЕ НАДЗВЫЧАЙ МАРУДНА РАЗГОРТВАЕЦЦА АСЕНЬНЯЯ СЯЎБА. З усіх калгасаў толькі «ІСКРА» выканала свой плян пасеву жыта на 14,7 проц. Пасеяна 7 га, з плянавых 48. Прыступілі да засеву калгасы: „ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ", «БАЛЬШАВІК», «ШЛЯХ ДА САЦЫЯЛІЗМУ». Ганебна адстаюць калгасы: „НАЕР ЛЭБН" і імя ЧАРВЯКОВА. У калгасе імя Чарвякова сямісашнікавая сеялка яўна ігнаруецца з-за коснасьці старшыні праўленьня ОСТРАГА і сэкратара партыйнай ячэйкі ШАХМЕТАВА.

■ ДЗЯЦЕЙ КАЛГАСЬНІКАЎ па ініцыятыве выязной рэдакцыі „Віцебскага пралетара" мабілізавала камісія па якасьці калгасу „Шлях да сацыялізму" на справу барацьбы за высокаякасную ўборку і барацьбу са стратамі. Арганізавана брыгада дзяцей па зборы калосьсяў. Брыгадай кіруе старшыня камісіі Клаўдзьдзя Пятухова. Дзеці пазьбіралі з 2 га калосьсі, якія пры абмалоце далі каля 4 пудоў хлеба.

■ ДОШКІ ЯКАСЬЦІ, ГОНАРУ І ГАНЬБЫ арганізаваны на старонках бюлетня выязной рэдакцыі „Віцебскага пралетара". Выязная рэдакцыя на дошку ганьбы за дрэнную якасьць уборкі занясла калгас „1 мая", чацьвёртую брыгаду калгасу імя Чарвякова—за зьняцьцё вільготнага жыта з поля. На дошку гонару занесены калгас імя Якаўлева за ўзорную уборку бяз страт і ўзорны абмалот.

■ 21 ЖНІЎНЯ АДБЫЛАСЯ НАРАДА СЕЛЬКОРАЎ. Пастановай нарады праводзіцца агульны сельсавецкі рэйд праверкі якасьці абмалоту пшаніцы. Рэйд ставіць аснаўной мэтай дапамагчы забясьпечыць азімыя палі высокаякасным адборным насеньнем. Ва ўсіх калгасах праводзяцца рэйды селькораў-ударнікаў сумесна з калгасным актывам праверкі гатоўнасьці складаў для збожжа, праверкі вучоту працадзён, праверкі выдачы авансаў калгасьнікам.

■ МАЛАТАРНЯ БДО-34 пераведзеная 21 жніўня ў чацьвёртую брыгаду для малацьбы жыта па віне адказнага за яе Казлоўскага выйшла са строю на 6 гадзін. У калгасе імя ЧАРВЯКОВА зусім не арганізавана конная малацьба, у рэзультаце чаго вялікія запасы неабмалочанага жыта скапляюцца ва ўсіх брыгадах. Безадкладна, поўнасьцю і высокаякасна правесьці абмалот—баявая задача.

■ Па сельсавету зараз у кожным з сямі калгасаў створаны насьценныя газэты. Насьценгазэта ў калгасе „ІСКРА" абвясьціла рашучую барацьбу стратам, недобраякаснай уборцы і недобраякаснай здачы дзяржаве збожжа. Пры актыўнай дапамозе насьценгазэты і камісіі па якасьці, калгас раней вазіўшы па 3—4 разы недобраякаснае жыта ў горад, зараз поўнасьцю і высокаякасна разьлічыўся з дзяржавай па жыце, выканаўшы гадавы плян.

■ ДА ВЫДАЧЫ АВАНСАЎ ПРЫСТУПЛЕНА ў суадпаведнасьці з колькасьцю і якасьцю выпрацаваных працадзён ў перадавым калгасе Віцебскага сельскага савету імя ЯКАЎЛЕВА. Калгас поўнасьцю выканаў гадавы плян паставак жыта і ячменю, засыпаў насенныя фонды.

■ У КАЛГАСЕ імя ЧАРВЯКОВА ВЫПУЧЩАНА ФОТА-ГАЗЭТА „Віцебскі пралетары" на ўборачнай і збожжапастаўках у Віцебскім сельсавеце". Матар'ял газэты моваю здымкаў і вострых, баявых надпісаў зрывае маску з ілжэўдарнікаў, лодыраў, паказваючы ўзоры добрай работы. Фота-газэта выклікала агульны інтарэс і адабрэньне ўсіх калгасьнікаў калгасу імя Чарвякова.

Сёньня выязное пасяджэньне рэспубліканскай камісіі па чыстцы.

Выязное пасяджэньне рэспубліканскай камісіі па чыстцы партыі пад старшынствам т. САХАРАВАЙ адбудзецца сёньня ў 11 гадзіне дня ў памяшканьні гаркому (пакой № 20).

Сёньня будуць разглядацца ацэнкі наступных тт.: САМСОНЕНКА (яч. каапгэхвікуму), ГАРЭЛІКА Л. Ю., ШЫМКІНА В. А., КАШЫРА (яч. політэхнікуму), КАЗАНСКАГА (фабрыка імя Цэткін), БЕЙЛІНА (яч. Белгандлю), УВАРАВА (вэтінстытут), КАЛІНЬНІКАВА (голкавая фабрыка), СЯМЁНАВА (яч. люстэрказавай фабрыкі), БАБАШЫНСКАГА (яч. пляцу МББ), ЛЯШЧЫНСКАГА (яч. цагельнага заводу № 1), КЛЯСА (яч. біяфабрыкі), БЛІНДАРА (яч. фанэрнага заводу), СУТЭРМАНА (яч. кіноустаноў), ВІХНІН (яч. скурзаводу).

ДЗЁНЬНІК ЧЫСТКІ ПАРТЫІ.

24 жніўня.

На 18 жніўня праверана 74 партыйных ячэек, з іх па групах ячэек вытворчых 31, калгасных 1, сельскіх 11, навучальных установаў 14, савецкіх і каапэрацыйных установаў 16, іншых 1. Зьявілася і прайшло чыстку 2185 членаў і кандыдатаў партыі. З гэтай колькасьці выключана 289 членаў, 125 кандыдатаў. Пераведзена з членаў у кандыдаты 212 чал., у спачуваючыя 25 чал., пераведзена з кандыдатаў у спачуваючыя 120 чал.

Фабрыка „Прафінтэрн".

Чыстку праходзіць парт'ячэйка бручнага цэху. 21 жніўня на сходзе прысутнічала 100 чал. Па справаздачы сэкратара парт'ячэйкі тав. ФРУМІНАЙ выказалася 6 чал. Па абгаварэньні кожнага правяраемага камуніста, у спрэчках выступала ад 3 да 5 таварышоў. За час чысткі рабочы калектыў цэху дабіўся значнага пералому ў ходзе выкананьня прамфінпляну. З 13 па 20 жніўня прамфінплян па цэху выкананы на 107,2 проц. 20 жніўня на праведзеным цэхавым мітынгу рабочых, з цэху зьнят ганебны рагожны сьцяг, які ён атрымаў два месяцы таму назад ад завадзкіх арганізацый за сыстэматычнае невыкананьне прамфінпляну.

Фабрыка „Сьцяг індустрыялізацыі".

Закончана праверка ячэйкі заказнага цэху. Усяго праверана 12 членаў і кандыдатаў партыі. На апошнім сходзе выказалася ў спрэчках 45 чал. Асабліва актыўна праходзіла абгаварэньне кандыдатуры загадчыка цэхам тав. ЛЯДМАНА.

Фабрыка „КІМ".

Сход па чыстцы 20 жніўня быў сарваны, з прычыны адсутнасьці падрыхтоўкі да яго, з боку парт'ячэйкі і фабкому.

Віцебская гарміліцыя.

У першы дзень чысткі на сходзе прысутнічала 42 партыйцы, 20 камсамольцаў і 174 беспартыйных. Па справаздачным дакладзе сэкратара партгалектыву Кузьняцова выступіла 16 чалавек. Трэба адзначыць, што з боку выступаўшых таварышоў слаба была разгорнута крытыка і самакрытыка. Спрэчкі насілі больш агульны характар.

Ячэйка ОРС чыгункі.

За чатыры дні чысткі праверана 28 чал. 21 жніўня чыстку прайшло 6 чал. У спрэчках выступала 20 чал. На сходзе прысутнічала да 200 чал. Некаторыя члены партыі спазьняюцца альбо зусім не зьяўляюцца на сход. Да такіх належаць МАЛОЧНІКАЎ, УКРАІНЦАЎ, АКСЕЛЬРОД, ХЭЙФЭЦ. Бюро ячэйкі абгаварыла пытаньне аб гэтых таварышох і за парушэньне партдысцыпліны вынесла ім партыйнае спагнаньне.

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ.

25 жніўня, а 6 гадзіне ўвечары, ў памяшканьні вялікай залі гаркому КП(б)Б адбудзецца агульна гарадзкі сход камсамольскага актыву па пытаньні ўдзелу камсамольскай арганізацыі ў чыстцы партыі.

Дакладчык—старшыня гарправеркому, сэкратар ЦК КП(б)Б т. ЖАБРОЎСКІ.

Сэкратарам калектываў і ячэек атрымаць білеты у гаркоме КСМ, маючы пры сабе сьпіс актыву.

ГАРКОМ ЛКСМБ.

Перадавікі збожжапаставак.

Асаблівую ўвагу зьвяртаем на якасьць.

Калгас «АСІНАЎКА», Бараўлянскага сельсавету, 15 жніўня завяршыў плян збожжапаставак азімага жыта. Здадзена 8 тон, што складае 100 проц. пляну. Акрамя гэтага, здадзена у лік 8 проц. для аплаты МТС 7 цэнтн. жыта.

Калгасьнікі ўзялі на сябе абавязацельства ў бліжэйшы час датэрмінова, поўнасьцю разьлічыцца з дзяржавай па астатніх збожжавых культурах, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на самую лепшую якасьць здаваемага збожжа.

Рыхтуем для здачы дзяржаве ў лік збожжапаставак ячмень і авёс.

Старшыня калгасу РАМАЩКІН.

З ПРАМОВЫ СЭКРАТАРА ЦК КП(б)Б тав. В. Ю. ЖАБРОУСКАГА

на ўсебеларускай нарадзе загадчыкаў раённых аддзелаў народнай асьветы і прадстаўнікоў школ, тэхнікумаў і ВНУ *).

Ва ўступнай частцы сваёй прамовы тав. ЖАБРОЎСКІ дае разгорнутую ха

Зробім 1933 г.—апошнім годам труднасьцяй.

Пераходзячы да задач бягучага году ўнутры нашай краіны, тав. Жаброўскі гаворыць:

— Тав. Сталін у адным са сваіх апошніх выступленьняў высунуў зада чу перад намі, камуністамі, перад рабо чымі і калгаснікамі,—зрабіць гэты 1933 год апошнім годам нашых труд насьцяй.

Таварышы, гэты лёзунг—задача най вялікшай гістарычнай важнасьці.

«Мы стварылі адзіную сацыялістыч ную базу для савецкай улады ў гора дзе і ў вёсцы. Ня стала двух проціле глых канцоў—буйнай сацыялістычнай прамысловасьці, якая зьнішчае капіта лістычныя элемэнты, і дробнай адна асобнай сялянскай гаспадаркі, якая па раджае капіталістычныя элемэнты» (Сталін).

У рэзультаце гістарычных перамог першай пяцігодкі Савецкі саюз стаў пе радавой індустрыяльнай краінай.

У нашых руках усе магчымасьці для хутчэйшай ліквідацыі цяперашніх за трудненьняў і, у прыватнасьці, харчо вых труднасьцяй, якія зьяўляюцца рэ зультатам недароду мінулых двух га доў і рэзультатам тэй разьюшанай шкодніцкай дзейнасьці буржуазна-ку лацкіх, нацыянал-дэмакратычных, контр рэвалюцыйных элемэнтаў у такіх асноў ных сельска-гас адарчых раёнах, як Паўночны Каўказ, поўдзень Украіны і Ніжняй Волгі, а таксама і ў нас, у БССР.

Вышэй рэвалюцыйную пільнасьць на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Відавочны чашы посьпехі ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва Зараз як ніколі мы маем торжэство на цыянальнай па форме і сацыялістыч най па зьместу культуры. Але разам з тым ёсьць і рад вельмі слабых месц. Ніякай супакоенасьці, вышэй піль насьці Клясава-варожыя, буржуазна-кулацкія, нацыяналістычныя вылазкі маюць сябе асабліва адчуваць на фрон це нацыянальна-культурнага будаўніц тва, на ідэалёгічным фронце, дзе кля савы вораг асабліва актывізуецца, ужываючы самыя тонкія замаскаваныя формы. Мы маем рад недапушчальных прарываў з боку курынай сьлепаты, па літычнай блізарукасьці, страты рэвалю цыйнай пільнасьці ў такіх установах як Наркамасьветы, як Беларуская Ака дэмія Навук, у радзе ВНУ і ВТНУ, на фронце мовы, гісторыі, літаратуры і т. д.

Старае кіраўніцтва Наркамасьветы страціла рэвалюцыйную пільнасьць—гэту якасьць так неабходную бальша вікам. „Старое кіраўніцтва Наркамась веты,—як сказана ў пастанове ЦК і СНК,—дапусьціла рад палітычных пра рываў у рабоце органаў асьветы: не забясьпечила правядзеньня дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб рабоце масавай і вышэйшай школы, аб палі тэхнізацыі школы, дапусьціўшы ў ра дзе выпадкаў зрыў палітэхнізацыі і скажэньне клясавай лініі ў праграмах, не вяло барацьбы за ачышчэньне апа рату Наркамасьветы як у цэнтры, так і на мясцох ад клясава-чужых, нац дэмаўскіх, бундаўскіх, сіяністскіх эле мэнтаў, праяўляючы да іх гніла-лібэ ральныя адносіны“.

Кіраўніцтва Наркамасьветы не вяло бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы пралетарскага інтэрнацыя налізму ў пытаньнях нацыянальнай палітыкі, а ў радзе выпадкаў патура ла буржуазна-кулацкім, нацыяналістыч ным тэндэнцыям».

Выключную засьмечанасьць буржуаз на-кулацкімі нацыяналістычнымі эле мэнтамі мы мелі таксама ў Беларускай Акадэміі Навук. Гэтыя элемэнты ня рэдка ўз ачальвалі інстытуты Акадэміі як напрыклад, праф. Бузук і г. д. Гэ та той самы Бузук, які ў радзе сваіх работ прапаведваў „тэорыю“ прымусо вай украінізацыі, беларусізацыі Кубані, Заходняй вобласьці, част і Ленінградз кай вобласьці і г. д.

У галіне беларускай мовы мелі мес ца адкрытыя буржуазна-кулацкія, нац дэмаўскія выступленьні. Рад работ ары ентавалі на фэадальна-клерыкальную беларускую тэрміналёгію, стаўка на польскія тэрміны. Вораг агітаваў за раўненьне на буржуазную культуру За хаду, адрыў беларускай мовы ад су часных запатрабаваньняў і задач сацы ялістычнага будаўніцтва. Тое, што зблі жае рабочых, калгаснікаў. Савецкай Беларусі з РСФСР, з рускімі рабочымі і калгаснікамі, прабавалі зьнішчыць, пабудаваць вітайскую сьцяну паміж імі

Гэтыя контр-рэвалюцыйныя нацыя нал-дэмакратычныя вылазкі мелі месца ня толькі тут у Менску. У радзе раё наў буржуазна-кулацкія, нацыяналі стычныя элемэнты дзейнічалі з асаб лівай нахабнасьцю прытым, непасрэдна і перш за ўсё ў вашай школьнай га ліне.

Вам, спадзяюся, вядома справа на стаўніка Крупскага раёну тав. Сьцяпу ра, калі «камуніст» Вінаградаў, заг райАНА Чапель і старшыня райкому саюзу работнікаў асьветы Галаўнёў (член ЛКСМБ) цкавалі Сьцяпура за тое, што ён карыстаецца рускай мовай у штодаённай прыватнай абстаноўцы.

У Крычаўскай школе на працягу доў гага часу арудавала гняздо клясава-варожых, буржуазна-кулацкіх нацыя налістычных элемэнтаў, ператвараючы школу ў цэнтр контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўскай агітацыі.

Выкладчык беларускай літаратуры—настаўнік Храмцоў (сын папа, скончыў духоўную семінарыю) у сваіх лекцыях адкрыта працягваў нацыянал-дэмакра тычныя погляды Гэты Храмцоў даказ ваў вучням адсутнасьць розьніцы па між нацыяналістычнымі поглядамі ад наго з роданачальнікаў нацыянал-дэма кратызму пісьменьніка Ф. Багушэвіча і.. ленінскай нацыянальнай палітыкай нашай партыі.

У працэсе праходзячай чысткі пар тыі, у часе праверкі вучэбных ячэек раскрываецца засьмечанасьць гэтых ячэ ек эсэраўскімі, буржуазна-кулацкімі, нацыяналістычнымі элемэнтамі, якія, прыкрываючыся партыйным білетам, творыць сваю антысавецкую шкодніц кую справу, правальваючы падрыхтоў ку кадраў для гаспадарчага і культур нага будаўніцтва, усяляк стараючыся сарваць справу раз віцця нацыяналь най па форме і сацыялістычнай па зьместу культуры ў БССР. Яркія прык лады гэтага шкодніцтва ўскрыты ў віцебскім вэткамбінаце, пэдінстытуце і ў сельска-гаспадарчым і жывёлагадоў чым інстытутах у Горках.

З нашых савецкіх бібліятэк (Дрыса, Сураж) выкідвалася такая літаратура як творы клясыкаў марксызму-ленінізму, за тое шырокае распаўсюджаньне мелі творы Дубровкі, Пушчы, нацдэмаў скія кнігі Зарэцкага, Коласа, Купалы і г. д.

У Дрысе ў кніжных магазынах пра давалі фашысцкую літаратуру, выданую ў Польшчы.

Мы мелі рад клясава-варожых контр рэвалюцыйных вылазак на фронце бе ларускай літаратуры. Памятаеце вядо мым вам выступленьні нацдэмаўскіх пісьменьнікаў Нікановіча, Сідарэнка, Баранавых і інш.

Побач з гэтым актывізуецца яўрэй скі, польскі шавінізм З нашага друку вы ведаеце аб радзе фактаў яўрэйскага шавінізму, працягваньня бундаўскай кантрабанды (Чарняўскі і інш.).

Мы пытаемся, чаму пасьля разгрому беларускага контррэвалюцыйнага на цыянал-дэмакратызму маглі аднаў ляць сваю контррэвалюцыйную шкод ніцкую дзейнасьць рэшткі не дабітага яшчэ канчаткова нацыянал-дэмакра тызму?

Нацыянал-дэмакратычныя, эсэраў скія, бундаўскія элементы маглі аруда ваць толькі таму, што ў радзе зьвень няў КП(б)Б прытупілася рэвалюцый ная пільнасьць, панавалі гніла-лібэ ральныя адносіны да нацыянал-апар туністычных, нацыянал-дэмакратыч ных, месараджэнскіх, двурушніцкіх элемэнтаў унутры нашай партыі.

Гэта магло мець месца таму, «што партыйныя і савецкія арганізацыі не зрабілі для сябе сапраўды бальшавіц кіх выводаў з урокаў нацдэмаўшчыны і прышчэпаўшыны, разьбітых, але яшчэ не дабітых у ВССР і якія акты візуюцца за апошні час, што беларус кія партыйныя, савецкія, прафэсыналь ныя і камсамольскія арганізацыі не вядуць бальшавіцкай барацьбы за ас ноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму і ў радзе выпадкаў патураюць буржу азна-кулацкім нацыяналістычным тэн дэнцыям» (з пастановы ЦК КП(б)Б).

Хіба-ж ня было гэтага гнілога лібэ ралізму, простага патураньня гэтым элемэнтам з боку старога кіраўніцтва Наркамасьветы, асабліва у галіне пра вядзеньня ленінскай нацыянальнай па літыкі?

Былы наркамасьветы т. Платун, на прыклад, у адным са сваіх выступ леньняў указваў: «Накіроўваючы агонь на вялікадзяржаўны шавінізм, як на асноўную небясьпеку данага пэрыяду, мы не павінны ні ў якай меры вы пускаць з поля зроку і беларускага нацыянал-дэмакратызму. Між тым, у сувязі з тым, што ў нас магчыма не выстарчальна вялася барацьба з вялі кадзяржаўным шавінізмам, у нас ёсьць гутаркі і настроі: вось, кажуць, калі з нацдэмамі, то вы стукнулі як сьлед, а калі з вялікарасійскімі шавіністамі, то ня зусім, прычым магчыма з нацдэма мі нават перагнулі».

І далей: «Калі пачалася жорсткая барацьба з беларускім нацыянал-дэма кратызмам, дык ужо думаюць, што ка лі якаё-небудзь кветачка, якую насілі беларускія нацдэмы, вышывачка або слуцкі пояс, дык гэта ўжо ёсьць на цыянал дэмакратызм. Калі нацдэмы сказалі-б хоць раз што небудзь добрае, то ўсё роўна, раз гэта сказалі або зра білі нацдэмы,—гэта ўжо ёсьць нацыя нал-дэмакратызм, гэта ўжо нікуды ня варта. Вось такое ахайваньне нацыя нальнай формы, нацыянальнага стылю з боку вялікадзяржаўнага ўхілу ў нас ёсьць і супроць гэтага трэба весьці ра шучую барацьбу».

У чым тут памылка тав Платуна? Па-першае, тав. Платун, гаворачы аб накіраваньні агню супроць вялікара сійскага шавінізму выходзіць не з партыйнай пастановы пытаньня, бо для яго доказам, адпраўным пунктам барацьбы з вялікадзяржаўным шаві нізмам зьяўляюцца „бачыце, гутаркі і настроі, што КП(б)Б невыстарчальна вядзе барацьбу супроць вялікадзяржаў нага шавінізму, а вось па нацыянал дэмакратах «стукнулі як сьлед і нават перагнулі».

Ня цяжка здагадацца, у каго т. Пла тун падслухаў гэтыя гутаркі, настроі, скаргі.

Нацыянал-дэмакратычныя элемэнты вельмі-б хацелі і прабавалі праз сваю агентуру ў радах партыі—нацыянал апартуністаў, двурушнікаў накіраваць барацьбу К'П(б)Б толькі супроць вялі ка-дзяржаўнага шавінізму і адцягнуць увагу беларускай партарганізацыі ад барацьбы з мясцовым нацыяналізмам.

Гаворачы аб накіраваньні агню су проць вялікадзяржаўнага шавінізму, а справу барацьбы з нацыянал дэмакра тызмам абмяжоўваючы толькі тым, каб «не выпускаць яго з поля зроку», аба раняючы гэта палажэньне вышэйпры ведзенай аргумантацыяй, тав. Платун яўна працягваў нацыянал-дэма ратычную кантрабанду. Тут у наяўнасьці спроба падмяніць барацьбу партыі на два фронты ў правядзеньні нацыяналь най палітыкі барацьбой толькі супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, спроба прыкрыць мясцовы нацыяналізм, што на руку беларускаму контррэвалюцый наму нацыянал-дэмакратызму, які са праўды разгромлен, але яшчэ канчатко ва не дабіт.

З гэтай буйнай палітычнай памылкі выцякае і другая, ня менш важная па мылка т. Платуна ў пытаньні аб на цыянальнай форме. Ён ідэалізуе нацыя нальную форму, мэханічна адрывае яе ад сацыялістычнага зьместу. Адарваў шы нацыянальную форму ад яе сацыя лістычнага зьместу, тав. Платун нямі нуча скачваецца на шлях процістаў леньня інтэрнацыянальнага, сацыялі стычнага зьместу культуры яе нацыя нальнай форме. Тут зноў такі замест выкрыцьця контррэвалюцыйна-нацдэ маўскай спэкуляцыі нацыянальнай формай, якая зьяўлялася ў руках на цыянал-дэмакратаў сродкам для правя дзеньня буржуазнай культуры, т. Пла тун уступае ў палеміку з тымі, якія ня лічаць заслугай нацыянал-дэмакра таў сказанае ці зробленае апошнімі «хоць раз што-небудзь добрае» ў абаро ну нацыянальнай формы, нацыянальна га стылю Хіба нацыянал-дэмакратаў характарызуе ое, што хто небудзь з іх сапраўды сказаў што-небудзь добрае і магчыма нават не адзін раз, а ня здзад ніцкая, контррэвалюцыйная, антыса вецкая іх дзейнасьць у адносінах да рабочых і працоўных сялян БССР?

Буржуазна-кулацкі нацдэмакратызм актывізуецца таксама і на Украіне. Вя дома, што б. работнік Украіны Шум скі на працягу раду год вёў, пры крываючыся партбілетам, агідную контр рэвалюцыйную работу.

Украінская партыйная арганізацыя яшчэ ў пэрыяд работы на Украіне тав. Кагановіча ўскрыла контррэвалю цыйную сутнасьць шумскізму, выкрыла і выгнала з Украіны Шумскага, Сала дуба і іншых, як контррэвалюцыянэраў і шкоднікаў, агентаў фашызму.

Пасьля ад'езду тав. Кагановіча, ад нак, рэ алюцыйная пільнасьць часткі камуністаў Украіны прытупілася, ня ўлічылі раду важнейшых новых моман таў у клясавай барацьбе, новай такты кі, новых манэўраў ворага. У рэзульта це аказалася, што наркамасьветы Укра іны нябожчык тав. Скрыпнік стаў пры цягальным цэнтрам гэтых нацыяналістычных, двурушніцкіх, шпіёнскіх, шкодніцкіх элемэнтаў. Скрыпнік да пусьціў рад грубейшых палітычных памылак і ў галіне нацыянальнага пы таньня і ў галіне сацыялістычнага бу даўніцтва і ў галіне падбору кадраў.

Шкодніцка-шпіёнскія нацыяналістыч ныя элемэнты хаваліся за сьпіной Скрыпніка, скарыстоўвалі яго ў сваіх контррэвалюцыйных мэтах.

Не забывайце, што кніга Гітлера «Моя барацьба», выступленьне Разэнбэрга, абяцаньне германскіх фашыстаў даць белапалякам Савецкую Беларусь і Са вецкую Украіну ў выглядзе кампэнса цыі за Польскі Калідор, за Данцыг—ёсьць пераклічка з беларускімі, украін скімі буржуазнымі нацыяналістамі, спроба знайсьці агульную мову, спроба змовіцца. А мы ведаем, што гэта змова там—у Польшчы, у Германіі—ідзе адкрыта. Таму асаблівую актуаль насьць, асаблівую надзейнасьць мае бязьлітасная барацьба з беларускім на цыяналізмам.

Тав. Сталін яшчэ на XVI зьезьдзе партыі ставіў пытаньне, што мясцовы нацыяналізм асабліва небясьпечны тым, што ён робіць стаўку на інтэрвэнцыю.

Мы павінны максымальна павысіць, выхаваць у сабе бальшавіцкую піль насьць. Самая патрэбная, самая неаб ходная,—як вучыў нас тав. Сталін,—якасьць бальшавіка—гэта, каб у яго была вострая рэвалюцыйная піль насьць. Толькі пры гэтай умове мы здолеем разьбіць, разьвеяць ушчэнт зладзейскія, шкодніцкія махінацыі кля савага ворага.

У БССР, ва ўмовах нацыянальнай рэспублікі, клясавы вораг нярэдка прыкрывае сваю антысавецкую контр рэвалюцыйную справу фальшыва-на цыянальным сьцягам. У гэтым яму актыўна дапамагаюць пераражэнскія, двурушніцкія элемэнты, якія ёсьць у радах КП(б)Б.

Цяпер рэдка які небудзь пераражэ нец двурушнік выступіць адкрыта з нацыяналістычнай устаноўкай, ён іх схавае да больш зручнага моманту і славесна-дэклярацыйна колькі хочаце будзе расьпінацца ў прызнаньні генэ ральнай лініі партыі. А вось глыбей паскрабеш гэтага пераражэнца, дву рушніка, глядзіш—ён адпеты нацыянал апартуніст.

Навочным прыкладам у гэтых адно сінах зьяўляюцца факты контррэвалю цыйнай дзейнасьці, ускрытай органамі ДПУ у сельскай гаспадарцы, якая пра водзілася пад кіраўніцтвам Масюкова, (б. нам. Наркамзема БССР), нацдэмаў скай дзейнасьці Бондара ў Дзяржпля не і г д.

Мы маем вялізарныя перамогі на фронце нацыянальнага культурнага бу даўніцтва. Ніколі культура ў БССР, на цыянальная па форме і сацыялістыч ная па зьместу, так не трыумфавала, не адзначала сваіх перамог, як на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва.

Адсюль задача быць яшчэ больш пільным, зорким на фронце нацыяналь на культурнага будаўніцтва.

Вострая бязьлітасная барацьба су проць бел-рускага буржуазна-улацка га нацыяналізму абсалютна не азначае, што мы праводзім рэвізію нацыяналь най палітыкі партыі. Вялікадзяржаўны шавінізм быў, ёсьць і застаецца галоў най небясьпекай. З усёй сілай бальша вікага ўдару мы павінны біць па вя лікадзяржаўным шавінізьме, па ўсяма праяўленьнях ухілаў у бок вялікадзяр жаўнага шавінізму, дзе-б яны не пра яўляліся, пад якой-бы маскай не хава ліся гэтыя тэндэнцыі.

ЦК УсеКП(б), як вы ведаеце, указаў на нашы буйнейшыя памылкі ў галіне правядзеньня нацыянальнай палітыкі партыі, указаў, што мы ў радзе месц проста патуралі буржуазна-кулацкім ка цыяналістам, не вядзем разгорнутай ба рацьбы з нацыяналістамі, якія выступа юць супроць партыі пад фальшыва-на цыянальным сьцягам.

ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало па ставіў рад пытаньняў, зьвязаных з умацненьнем пралетарскага інтэрнацы яналізму ў нашай рабоце.

Пры правядзеньні нацыянальнай па літыкі партыі нам неабходна выходзіць з асноўнага, што галоўнай, першачар говай і ўсёвызначаючай задачай на цыянальнай палітыкі партыі зьяўляец ца зблiжэньне пралетараў і поўпралета раў розных нацый для супольнай ба рацьбы супроць капіталіста, супроць кулака, шкодніка, апартуніста.

Гэтыя пытаньні, пытаньні правільна га правядзеньня ленінскай нацыяналь най палітыкі партыі, правільнае баль шавіцкае выхаваньне беларускіх кадраў на гэтых пытаньнях з асаблівай чу ласьцю, з асаблівай бальшавіцкай прын циповасьцю адстойвае і праводзіць ЦК і асабліва першы сэкратар ЦК тав. Гікало.

Усямерна павысіць якасьць работы школ.

Нашы задачы ў галіне школь ага бу даўніцтва вызначаюцца тымі задачамі, якія былі пастаўлены XVII партыйнай канфэрэнцыяй перад другой пяцігодкай.

„Усямернае паскарэньне ажыцьця ўленьня ўсеагульнай пісьме насьці на сельніцтва, хутчэйшае ўзьняцьцё ўсёй справы тэхнічнай асьветы і ўзмоцненае матар'яльнае падтрыманьне дзяржавай разьвіцця навукі ў СССР такавы блі жэйшыя задачы, якія прадстаўляюць сустаўную частку агульнай задачы па будовы сацыялізму ў нашай краіне“.

Якасьць работы школ за апошнія га ды ў рэзультаце правядзеньня дырэк тыў партыі аб школьным будаўніцтве, поўмоўна і значна ўзрасла. Павысіла ся актыўнасьць настаўніка і ўзрасла яго адказнасьць за арганізацыю рабо ты, павысілася пасьпяховасьць дзяцей і г. д.

Але, таварышы, асноўнае яшчэ ня зроблена. „Карэнны недахоп“ у рабоце школы—нізкі ўзровень агульна-адука цыйных ведаў да гэтага часу ня зьні шчан, якасьць работы школ да гэтага часу яшчэ на нізкім узроўні. У радзе раёнаў ёсьць вялікі адсеў.

Адсеў па Чашніцкім раёне складае 22 проц, Лагойскім раёне—11 проц., Горацкім — 10 проц. З указанага ліку значная частка школьнікаў адсейваец ца па няўважлівых прычынах. Пры наяўнасьці раду станоўчых прыкладаў добрай пасьпяховасьці — у Полацку 94 проц., Гомелі 93 проц., Воршы 92 проц., Менску—91 проц.,—мы маем рад адмоўных фактаў.

У Дубровенскім раёне, напрыклад пасьпяховасьць складае толькі 65 проц. Тое-ж і з пасьпяховасьцю ў Карман скім (74 проц.), у Лагойскім (75 проц.), Горацкім (78 проц.), Рэчыцкім (80 проц.), Старобінскім (80 проц.). Адсюль вялікі процант другагодніцтва.

У мінулым годзе мы мелі ў сярэд нім 15 проц. другагоднікаў, у гэтым таксама 15 проц. Гэта, таварышы, ні куды ня варта. Гэта вялікі мінус у на шай рабоце. Навукова дасьледчы інсты тут камуністычнага выхаваньня правёў абсьледваньне 7 ФЗС і 3 ШКМ, аха піўшы каля 1.600 вучняў. У выніку аб сьледваньня выявілася надзвычай дрэн нае ўсваеньне элемэнтарных асноў ма тэматыкі. Тое ж мы бачым у ВНУ і ВТНУ. Вось даныя абсьледваньня гэ тых ФЗС і ШКМ: сяк-так усвоілі вы лічэньне плошчаў 47 проц. вучняў 5-ай групы, 70 проц. 6 ай і 75 проц 7-ай групы.

Больш за ўсё адстаюць школы ў ве даньні беларускай мовы і матэматыкі.

Такім чынам, адзначаны ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б «карэнны неда хоп» школы, які заключаецца ў тым, што „навучаньне ў школе не дае на лежнага аб'ёму агульна-адукацыйных ведаў і нездавальняюча вырашае зада чу падрыхтоўкі для тэхнікумаў і для вышэйшай школы зусім пісьменных іх дзей, якія добра ўладаюць асновамі на вук (фізыка, хэмія, матэматыка, род ная мова, геаграфія і інш.)“,—намі за ўмовах БССР яшчэ далёка не пера можан.

У мэтах умацаваньня ведаў вучняў і павышэньня якасьці работы школ, большай адказнасьці педагогаў уведзе ны іспыты ў школе.

Станоўчая роля іспытаў у спр ве ўмацаваньня работы школы відавочна. Але ў гэтым годзе і Наркамасьветы і ЦП саюзу мала зварачалі ўвагі на пра вядзеньне гэтага важнейшага мера прыемства.

Школы не атрымалі своечасова вы разных указаньняў аб парадку і фор мах правядзеньня іспытаў. Дырэктывы Наркамасьветы ў гэтым пытаньні зьмя ніліся ня раз Інструктарскі апарат Наркамасьветы, райАНА ня прышоў на дапамогу школе, не заняў вядучага месца ў арганізацыі правядзеньня іспытаў.

У рэзультаце мы мелі рад перагі баў і „лявацкага“ і праваапартуністыч нага характару. нярэдка іспыты пера тваралися ў экзамэны старога тыпу. У радзе месц ствараліся спэцыяльныя ка місіі па экзамэнах, што выклікала не здаровыя зьявы сярод вучняў і значны адсеў.

Мы мелі сярод некаторай часткі вуч няў, галоўным чынам вышэйшых на вучальных установ—настроі, накірава ныя супроць іспытаў. Гэтыя нездаро выя зьявы не сустракалі належнага адпору з боку партыйных, камсамоль скіх арганізацый і пэдпэрсаналу. Мы павінны мабілізаваць увагу вучняў на кол пытаньняў падрыхтоўкі і правя дзеньня іспытаў. Мы іх павінны лепш правесьці ў будучым годзе. Буйнейшым тормазам хутчэйшай ліквідацыі «карэн нага недахопу» ў рабоце школ зьяўля ецца вельмі дрэнная арганізацыя ву чэбнай работы, школьнага рэжыму, дысцыпліны ў школе.

Барацьба за дысцыпліну—неабходная ўмова паляпшэньня якасьці работы школы. Вядучую арганізацыйную ролю ў справе стварэньня моцнай сьвядо май дысцыпліны ў школе адыгрывае настаўнік. Правільная арганізацыя ву чэбнага працэсу мае вялізарнае выха ваўчае ўзьдзеяньне на дысцыпліну.

Ці можа ўмацоўваць дысцыпліну вуч няў такое вядзеньне ўроку, як напры клад, у адной з груп 24-ай менскай ФЗС? У ёй час лекцый разьмяркоўва ецца наступным чынам: праверка пры су ных дзяцей—7 мінут, падрыхтоўка вучнямі алоўкаў, сшыткаў і г. д.—4 мі нуты, супакойваньне—6 мінут, пабоч ныя гутаркі 5 мінут, разам 22 міну ты непрадукцыйнай работы ў школе, г. зн. палова лекцыі.

Такое вядзеньне лекцыі можа разва ліць добрую дысцыплінаваную групу ў школе.

Настаўнік, ідучы на лекцыю, павінен ня толькі ведаць, што ён сам будзе рабіць, але і ўця нудь вучняў у пад рыхтоўку да лекцыі. Яшчэ да прыходу ў клясу настаўніка, вучні самі павін ны падрыхтаваць падручнікі, алоўкі, наглядныя дапаможнікі—карты, глобу сы і г. д., а для гэтага вучні павінны ведаць, якая ў іх будзе лекцыя і атры маць за даньне ад настаўніка падрых тавацца да лекцыі яшчэ да званка.

Мы маем рад буйнейшых прарываў у рабоце школ і па лініі палітычнага выхаваньня дзяцей. Падамо некалькі фактаў. Вось, напрыклад, грамадзянаў ца Бажанаў гаварыў: «Сацыялістычная гаспадарка гэта такая, якая эксплёатуе іншыя гаспадаркі. Апрача таго эксплёа туе рабочых і сялян. Капіталістычная гаспадарка—буйная гаспадарка, якая атрымлівае вялікі прыбытак, пасьля чаго мае магчымасьць павялічваць сваё прадпрыемства і плаціць рэгулярна за работную плату рабочым». Вось як рас тлумачыў клясавую сутнасьць адной гаспадаркі і другой. Перад намі яўны клясавы вораг.

У Гомелі настаўнік грамадзянаўца заявіў, што «рэвалюцыя 1905 году бы ла буржуазна-дэмакратычнай таму, што рабочая кляса была пад кіраўніцтвам буржуазіі». Або, напрыклад, адзін на стаўнік Рэчыцкага раёну тлумачыў, што «Ленін рэвалюцыю 1905 году казы в ў генэральнай рэпэтыцыяй таму, што на чале гэтай рэвалюцыі стаялі генэралы» (Сьмех).

Настаўніца Віткоўская на занятках у школе задала пытаньне: хто жыве ў го радзе? Вучні адказалі, што жывуць у горадзе рабочыя, служачыя і саматуж нікі, а яна паправіла: «Не, дзеці, па лякі, аўрэі і беларусы». Усякі бачыць, што гэта «паправўка» носіць яўна ва рожы нацыяналістычны характар

А вось прыклады, якія гавораць аб кваліфікацыі некаторых настаўнікаў. Настаўнік Селецкай школы, Быхаўска га раёну, гаворыць, што, «Чорнае мо ра знаходзіцца на Захадзе». А па дум цы настаўніка Асавецкай школы та го-ж раёну «Індыя знаходзіцца ў Афрыцы».

У школе Тураўскага раёну Міхаль цоў растлумачыў вучням, «што такое сацыялізм»: «Сацыялізм гэта калі лю дзі будуць есьці з аднаго катла і на крывацца адной коўдрай» (Сьмех)

У аднэй са школ Гомелю наст пным чынам праходзіць урок геаграфіі. На стале стаіць глобус. Настаўнік тыча пальцам у глобус і тлумачыць: «Вось гэта ва а, на зямлі вада, пад зямлёй вад« і зямля плавае на вадзе» (Сьмех).

А вось адзін настаўнік Віцебскага раёну дае дзецям такі прыклад: „Калгас мае форму трыкутніка з плошчаю ў 500 га і вышынёю ў 218 га, вуча так будзе засеян рознымі кул турамі, пад лічыце»... (Сьмех).

А вось настаўніца выкладае геагра фію: „Рэкі БССР даюць мала белага вугалю. Толькі каля Воршы на Дзі ры, дзе ёсьць вялікія парогі, пабудава на магутная электрастанцыя „Асінбуд“ (Сьмех). Якая гэта электрастанцыя, на якім «белым вугалі» яна пабудавана—гэта ведае зараз, бадай, кожны піянэр.

Добра сьмяецца, але гэта ня сьмешна.

Ня думайце, што тут толькі палітычная няпісьменнасьць, тут бязумоўна прымае ўдзел і рука клясавага вора га. З другога боку, гэтыя факты сьведчаць аб вельмі нізкім узроўні значнай часткі школьных работнікаў.

Настаўнік—цэнтральная фігура пэдагагічнага працэсу.

Гэта сур'ёзныя факты. Настаўнік—гэта цэнтральная фігура пэдагагічна га працэсу. Наша партыя дала рашу чы бой «лявацкай» тэорыі адмірань ня школы, якая зводзіць ролю пэдаго га да нуля, падняла аўтарытэт настаў ніка, указаўшы на ўсё «узрастаючую ролю настаўніка ў справе навучаньня дзяцей асновам навук» (ЦК УсеКП(б).

Таму якасьць кваліфікацыі нашых пэдагогаў павінна быць высокай і ў агульна-адукацыйных і ў палітычных адносінах. Уладзімер Ільліч Ленін ня раз указваў на тое, што якасьць вучо бы залежыць ад складу лектароў.

Ён пісаў: „Ва ўсякай школе самае важнае—ідэйна-палітычны напрамак лекцый. Чым вызначаецца гэты напра мак? Поўнасьцю і выключна складам лектароў. Вы дасканала разумееце, та варышы, што ўсякі „кантроль“, усякае «кіраўніцтва», усякія «праграмы» стату та і інш.—усё гэта пусты гук у адносінах да складу лектароў Ніякі кантроль, ніякія праграмы абсалютна ня ў ста не зьмяніць таго напрамку ведаў, якое вызначае па складам лектароў. І ніко лі і нідзе ў сьвеце ні адзінная пава жаючая сябе арганізацыя, фракцыя або група ня вобмецца падзяляць адказнасьць за школу, напрамак якой ужо прадвырашан складам лектароў, калі гэты напрамак варожы».

Трэба ачысьціць рады настаўніцтва ад клясава-варожых элемэнтаў. Трэба змагацца за пісьменнага, палітычна вытрым нага, падрыхтаванага настаўніка.

Зразумела, мы маем у радох настаў ніцтва вялізарную колькасьць сапраў дных энтузыястаў-ударнікаў, пэратва раючых школу ў сапраўдную зброю камуністычнага выхаваньня нашага сацыялістычнага маладняка і наву чаньня яго асновам навук. Вось толь кі асобныя прыклады:

ДЗЯНІСЁНАК Рыгор Рыгоравіч (Шк лоўскі раён), беспартыйны, выхадзец з сялян-беднякоў, у даны момант—калгасьнік-ударнік. Зьяўляе па загад чыкам паказальнай ШКМ. Работа школы пастаўлена добра. Уведзен ражым школы. Пасьпяховасьць па школе 91—93 проц Дысцыпліна доб рая.

Тав. Дзянісёнак з яўляецца актыў ным памоцнікам маладому настаўніц тву ў іх рабоце. Ён як мэтадыст ро іць даклады вытворча мэтадычнага зьмес ту. 5 год зьяўляецца старшынёю кантрольна-рэвізійнай камісіі сельса вету, два разы выбіраўся дэлегатам на раённы зьезд саветаў. Тры гады зьяў ляецца старшынёю рэвізійнай камісіі калгасу «Бальшавік», які вывеў з гліны бокага прарыву. Прэміяваны за доб рую, вытворча-грамадзкую работу ча тыры разы.

ХРАЛОВІЧ Гардзей Міхайлавіч, за гадчык Семежаўскай пачатковай ШКМ Чырвона-Слабодзкага раёну. Член КП(б)Б, ШКМ адзначаецца высокай дысцыплінай і пасьпяховасьцю. За добрую работу школа прэміявана РВК.

Загадчык навучальнай часткай і настаўніца гісторыі школы імя Лекер та Гомельскага раёну, т Рабінэр Р. Р. Дзякуючы своечасовай арганізацыі, сы стэматычнай дапамогі адстаючым вуч ням, процант пасьпяховасьці вырас з 80,9 проц. пад канец 1 кварталу да 94,8 проц. пад канец навучальнага го ду. За апошнія два гады шасьць раз прэміявалася як лепшы ўдарнік шко лы.

У Ельскім раёне тав. ТАМАШУК Тэафан Іванавіч зьяўляецца загадчы кам Багуцінкай школы і вядзе 2 ю і 3-ю групы. Праграма па ўсіх прадме тах у групах пройдзена на 100 проц. Пасьпяховасьць у 2-й і 3-ай групах 95 проц., ва ўсёй школе—90 проц. Тав. Тамашук разгарнуў індывідуаль нае спаборніцтва і ўдарніцтва сярод вучняў груп, правяраючы штодзень вы нікі спаборніцтва

Ёсьць цэлы рад іншых фактаў доб рай ударнай работы настаўнікаў, рад фактаў гераічнай, адданай, самаахвяр най работы нашага савецкага настаў ніка.

Я лічу буйным недахопам нашага Наркамасьветы, нашага ЦП саюзу, у асаблівасьці нашых раёнаў тое, што яны слаба папулярызуюць гэту ўдар ную самаахвярную работу нашых нас таўнікаў. Іх лепшы вопыт траба аба гуліць, зрабіць яго здабыткам мільён ных мас, а ня толькі школьных работ нікаў.

ЧЫМ-ЖА ДОБРЫ ЗАГАДЧЫК ШКО ЛЫ, ДОБРЫ БАЯВІК-УДАРНІК ВУЧО ВЫ, ЯКІ ВЫКОНВАЕ СВОЙ ПЛЯН, ПРАГРАМЫ, ЧЫМ ЁН ГОРШЫ ЗА ДЫ РЭКТАРА ПРАДПРЫЕМСТВА, ЯКІ ВЫ КОНВАЕ ПРАМФІНПЛЯН, ЧЫМ ЁН ГОРШЫ ЗА ІНЖЫНЭРА, ЯКІ ПРА ВІЛЬНА НАЛАДЗІЎ ТЭХНАЛЁГІЧНЫ ПРАЦЭС І АДЗНАЧАЕЦЦА Ў ГАЗЭ ЦЕ? ЁН НЯ ГОРШЫ, ЁН ТАКІ-Ж ГЕ РОЙ, ТАКІ-Ж АДДАНЫ БУДАЎНІК САЦЫЯЛІЗМУ.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 25 жніўня 1932 г. указвае: «Усямерна пашырыць практыку заахвочваньня і прэміяваньня настаўнікаў за лепшыя ўзоры работ, а таксама ўлік і выка рыстоўваньне ў кіраўніцтве дасягнень няў перадавых школ і настаўнікаў».

Трэба сказаць, таварышы, што рай АНА—важнейшае асноўнае зьвяно ў барацьбе за паляпшэньне работы шко лы, да гэтага часу не перабудавалі сваёй работы. Праўда, тут ёсьць рад так званых «аб'ектыўных» прычын—часта бяруць вашага брата на загатоў кі і інш. кампаніі. Гэта бязумоўна трэба нармалізаваць.

Да рэчы, сёньня тав. Гікало падпі саў тэлеграму аб тым, каб спыніць пэрманэнтныя камандыроўкі работні каў школ. Асноўны ваш абавязак—рых тавацца да навучальнага году, а там —спалучайце гэту справу. Мейце гэта на ўвазе, бейцеся за тое, каб гэту тэ леграму, гэ

На нарадзе ў сэкратара гаркома КП(б)Б тав. І. Г. ЖУРАЎЛЁВА.

Пакрыць запазычанасьць!

Віцебская прамысловасьць у першай дэкадзе жніўня работала ГОРШ чым у ліпені. Калі ў ліпені праграма была выкананa на 94,4 проц., то першая дэкада жніўня дае зьніжэньне. Плян па рэспубліканскай прамысловасьці выкананы на 92 проц.

Гэта гаворыць аб тым, што пастанова ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК аб рабоце прамысловасьці не атрымала яшчэ свайго праламленьня ў практычнай рабоце многіх фабрык і заводаў.

Чым-жа тлумачаць кіраўнікі прадпрыемстваў зьніжэньне тэмпаў? Паслухаем самих дырэктароў. Іх выступленьні на нарадзе 17 га жніўня ў сэкратара гаркома КП(б)Б т. І. Г. Жураўлёва, красамоўна сьведчаць аб наяўнасьці на некаторых прадпрыемствах апартыстычнага самацёку ў рабоце, адсутнасьці бальшавіцкай барацьбы за ажыцьцяўленьне пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб становішчы віцебскай парт арганізацыі.

„ЯШЧЭ ЁСЬЦЬ ЧАС— НАВЯРСТАЕМ"

Мы недастаткова змагаемся за ліквідацыю ўнутраных непаладак,—гаворыць тав. ВАРКІН, дырэктар фабрыкі «Прафінтэрн». Калі-б мы змаглі сэкусьціць накопленую прадукцыю на апошніх апэрацыях у склад, мы плян выканалі-б куды больш. Аб гэтым сьведчыць работа бручнага і пэлітовага цэху за апошнія дні. Думаем ліквідаваць запазычанасьць за першую дэкаду.

Вось такая работа характэрна для многіх прадпрыемстваў Віцебску. І зусім правільна і метка сэкратар гаркому КП(б)Б тав. ЖУРАЎЛЁЎ адзначыў у сваім уступным слове, што многія кіраўнікі фабрык і заводаў у першую дэкаду сядзяць, склаўшы рукі, нічога не прадпрымаюць для нармальнай работы прадпрыемства, разважаюць: «яшчэ ёсьць час, навярстаем у наступных дэкадах». А ў наступныя дэкады пачынаецца мітусьня і з гэтага нічога ня выходзіць.

Дырэктары прадпрыемстваў павінны ведаць кожную гадзіну, кожны дзень, як выконваецца прамфінплян кожнага варштату, брыгады, агрэгата, сваечасова прымаць належныя меры і недапускаць малейшага прарыву. Нельга ні ў якім разе прапаваць так, як працуе дырэктар заводу «Камінтэрн» (ЭЛЬТЭРМАН), які ня ведае выкананьня прамфінпляну ня толькі кожны дзень, але ж нават пасьля месяцу работы прадпрыемства, бо плянаваньне і вучот пастаўлены нікудышна.

УСЁ „ПРЫБЛІЗНА".

Фабрыка ІМЯ ЛЕКЕРТА, якая ўвесь час адстае ў выкананьні праграмы, у першай дэкадзе жніўня работала яшчэ горш, выканаўшы плян толькі на 63,3 проц. І вось, дырэктар фабрыкі тав ХАЙКІН замест таго, каб сказаць, што ён робіць як кіраўнік для ліквідацыі ганебнага адставаньня, спасылаецца на «аб'ектыўныя прычыны»—не хапае рабочай сілы, многія рабочыя пасьля адпачынку ня вышлі на работу, дрэнная арганізацыя ў цэхах і інш. Тав. ЖУРАЎЛЁЎ ставіць пытаньне: што ён, як дырэктар, зрабіў канкрэтна для зьнішчэньня гэтых недахопаў на фабрыцы, у прыватнасьці хаця-б адносна перабудовы работы?

— Перакінулі чатыры, ці пяць інжынэрна тэхнічных работнікаў у цэх.

— А дакладней, колькі ўсё-ж такі?, — запытвае тав. Жураўлёў. Хайкін зацінаецца і не адказвае.

— Наколькі ўчора выканалі прамфінплян па фабрыцы?

— Прыблізна на 70 проц.

Такі адказ гаворыць аб адсутнасьці сапраўднай барацьбы з боку многіх кіраўнікоў прадпрыемстваў за прамфінплян, за перабудову гаспадарча тэхнічнага кіраўніцтва фабрыкі, працягвае панавать «наведаньне» што робіцца ў цэху, брыгадзе. Бязумоўна, такое неканкрэтнае кіраўніцтва не забясьпечвае выкананьне праграмы.

ПА ЛІНІІ НАЙМЕНШАГА СУПРАЦІЎЛЕНЬНЯ.

А дырэктар лесазаводу імя Правды тав. РОЗЭНБЛЮМ, гаворачы аб ганебных лічбах выкананьня пляну ў ліпені (77,59 проц.), у першай дэкадзе жніўня (72,59 проц.), тут-жа пералічвае тыя «мерапрыемствы», якія дырэкцыя ўжывае для ліквідацыі прарыва: устанаўленьне работы заводу бяз выходных дзён і чаканьне ад гаркому дапамогі наборы рабочай сілы. Нечага сказаць, рацэпт арыгінальны! Тав. РОЗЭНБЛЮМ замест ліквідацыі ўнутраных непаладак, частых прастояў вартатаў, псаваньня мэханізмаў, замест поўнай нагрузкі кожнага рабочага сямігадзіннай работай, што з усёй яскравасьцю паставілі перад намі ленінградзкія рабочыя, прыдумаў выхад за лік выходных дзён ліквідаваць прарыў. І тав ЖУРАЎЛЁЎ на гэта зрабіў наступную заўвагу: нічога з гэтага ня выйдзе, партыя нікому не дазволіць, каб рабочыя ня мелі выходных дзён. Гэта павінны зразумець і іншыя кіраўнікі прадпрыемстваў, якія таксама практыкуюць гэта ў сваёй рабоце.

АБ ЧЫМ НЕ ГАВАРЫЛІ ДЫРЭКТАРЫ?

Ні ВАРКІН (фабрыкі «Прафінтэрн»), ні ХАЙКІН (фабрыка імя Лекерта), ні ФАЙНБЭРГ (шчоткамбінат) гаворачы аб недахопе рабочай сілы, ставячы пытаньне перад гаркомам аб дапамозе ім дастаць рабочую сілу, НІ СЛОВА НЕ СКАЗАЛІ, ШТО ЯНЫ РОБЯЦЬ ДЛЯ ПАВЫШЭНЬНЯ КВАЛІФІКАЦЫІ МАЮЧЫХСЯ РАБОЧЫХ? А імем з такім шляхам — шляхам узьняцьця кваліфікацыі рабочых і павышэньня прадукцыйнасьці працы, можна дабіцца пэўнага эфэкту, паслабіць недахоп рабочай сілы.

Нічога не сказалі дырэктары, што яны прадпрымаюць для паляпшэньня культурна-бытавых умоў рабочых і гэтым самым для ліквідацыі вялікай цякучасьці, маючайся на прадпрыемствах.

У АРГАНІЗАЦЫІ САМАЗАГАТОВАК— САМАЦЁК.

Інфармацыі старшыні ЗРК фабрыкі „СЬЦЯГ ІНДСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" тав. КАЦА, заводу „ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ" тав. ІЦЫКСОНА, фабрыкі імя КІМ тав. ВЫДРЭВІЧА гаворыць аб тым, што за апошні час справа разгортваньня самазагатовак пушчана ў значнай частцы на самацёк. Гэтым самым значна пагоршылася работа сталовак на большасьці прадпрыемстваў.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што кіраўнікі ЗРК не зрабілі для сябе адпаведных вываадаў з пастановы ЦК КП(б Б аб становішчы віцебскай парт тыпнай арганізацыі, не змагаюцца пабальшавіцку за паляпшэньне рабочага снабжэньня. Да гэтага часу яшчэ існуе ўраўнілаўка ў рабочым забесьпячэньні, што, бязумоўна, мае свой адбітак на выкананьні пляну.

Трэба адзначыць, што ня гледзячы на важнасьць пытаньняў абвесткі дню, некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў не палічылі патрэбным прыйсьці на гэту нараду. Ня прыйшоў дырэктар уціль камбінату тав. БЕРХІН, друкарні „Камінтэрн" тав. ЛЕВІН, старшыня ЦРК тав. КІСЬЛІК і інш. Гэта гаворыць аб тым, што дробна буржуазная распусьнічанасьць, сямейнасьць, разгільдзяйства яшчэ ня зжыта ў асобных звяньнях віцебскай партыйнай арганізацыі Патрэбна яшчэ мацней ударыць па носьбітах недысцыплінаванасьці і расхлябанасьці.

Тав. ЖУРАЎЛЁЎ, падводзячы вынікі работы прамысловасьці за першую дэкаду і падагульняючы работу нарады, застанавіўся на наступных момантах.

Да гэтага часу многія кіраўнікі прадпрыемстваў яшчэ ня зжылі самацёку ў рабоце, займаюцца дэкларацыйнасьцю. Нікуды ня варты такія адносіны да дырэктыў партыі! Да пастаноў ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасьці.

Вельмі мякка мы да гэтага часу на дыходзілі да таго альбо іншага кіраўніка прадпрыемства. за невыкананьне прамфінпляну, ня прыцягвалі да адказнасьці. У далейшым мы гэтага не дапусьцім. Будзем прыцягваць да суровай адказнасьці тых гаспадарнікаў, якія не палічаць для сябе патрэбным зрабіць рашучыя вывады з неадпаведных дырэктыў партыі.

Мно а мы гаворым аб перабудове гаспадарча-тэхнічнага кіраўніцтва і амаль нічога ня робім у гэтым напрамку, бо рэзультатаў ня бачна. Перабудова работы мае на мэце выкананьне прамфінпляну. А мы гэтага ня маем. Значыць, што мы работу па перабудове кіраўніцтва на значнай частцы прадпрыемстваў Віцебшчыны праводзім фармальна, не канкрэтна. Узяць хаця-б абслугоўваньне начных зьмен. Радка хто з дырэктароў бывае на трэцяй зьмене, не гаворачы ўжо аб партыйных і прафэсыянальных работніках. А гэта мае вялікае значэньне. Значная частка рабочых работаюць на гэтай зьмене. Апошнія нават не забясьпечаны інжынэрна-тэхнічным нэрса ам. А мы гаворым усюды аб тым, што перабудавалі сваю работу. Грошцана такой перабудове! Нічога яна ня варта, калі прамфінплян ня выконваецца.

Многія спасылаліся на адсутнасьць рабочай сілы, што гэта зьтуляецца тормазам у невыкананьні прамфінпляну, але ж амаль ні адзін дырэктар не сказаў, што ён робіць для паляпшэньня культурна-бытавых умоў рабочых, як ён клапаціцца аб „дробязях" рабочага быту. А гэта мае вялікае значэньне.

Выступленьне старшыні ЗРК нам гаворыць аб прарывах ў справе сапраўды баявой, дзелавой пастаноўцы рабочага забесьпячэньня, гаворыць аб недаацэнцы з боку многіх кіраўнікоў ЗРК і прадпрыемстваў пытаньняў САМАЗАГАТОВАК. За апошні час мы маем значнае паслабленьне гэтай работы. Кіраўнікі ЗРК, мабыць, лічаць, што прадукты прыдуць самі да іх ў краму, не змагаюцца за разгортваньне самазагатовак. Чаму віцебскім прадпрыемствам ня ўзяць прыклад са „СЬЦЯГА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ", узяць шэфства над якім небудзь раёнам, дапамагчы яму людзьмі, дапамагчы яму адраманцаваць сельска-гаспадарчы інвэнтар, а ў сваю чаргу рэйн дапаможа фабрыцы альбо заводу нарыхтаваць прадукты пасьля выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай. Але ж ня робяць гэтага тры-утрэкі вашых прадпрыемстваў, чакаюць чагосьці. І ў выніку за апошні час пагоршыліся абеды ў частцы сталоўках.

Многія гаварылі аб недахопе рабочай сілы. Але справа ня толькі ў тымчастым прастоі, беспараджальнасьць, адсутнічаньне гаспадарчага разьліку, ялікі процант браку,—весь што перашкаджае выкананьню прамфінпляну, а паміж іншым ніхто за гэта не адказвае. Колькі загадчыкаў цэхаў, брыгадзіраў, прыёмшчыкаў заплацілі за брак? З каго ўтрымалі за брак, пра стой на прадпрыемстве? Ні адзін з гаспадарнікаў аб гэтым не сказаў ні слова, бо па самой справе гэтага няма, ніхто пакуль што не адказвае за гэта матар'яльна.

Да гэтага часу яшчэ на шэрагу прадпрыемстваў Віцебшчыны мае месца дробнабуржуазная ўраўнілаўка ня толькі ў зарплаце, але ж таксама і ў снабжэньні. Ня можа надалей так быць. Той, хто работае больш—павінен атрымаць больш. Ударнікі павінны забясьпечваецца ў першую чаргу. Ня можа быць адналькавага падыходу да ўсіх рабочых на прадпрыемствах і да самих прадпрыемстваў. Тыя прадпрыемствы, якія маюць большае значэньне, лепш работаюць—павінны лепш забясьпечвацца. На многіх прадпрыемствах маецца стол ударнікаў, надпіс ёсьць, але часта гэты стол не адрозьнізаецца ад агульнага „меню". Кіраўнікі ЗРК павінны зараз-жа зрабіць належныя вывады, перабудаваўшы ўсю работу па забесьпячэньні рабочых, у першую чаргу ўдарнікаў.

Заўтра ж дырэктары павінны склікаць ударнікаў, адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал, расказаць аб нарадзе і патрабаваньнях, якія гарком прадстаўляе кожнаму з кіраўнікоў фабрык і заводаў

Намеціць сумесна з імі канкрэтныя мерапрыемствы для ліквідацыі прарываў, маючыхся на частцы прадпрыемствах, каб у другой дэкадзе пакрыць запазычанасьць першай дэкады і пачаць працаваць так, к б выканаць пастанову ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК аб ліквідацыі запазычанасьці ў другім паўгодзьдзі першага паўгодзьдзя ня толькі па колькасных паказальніках, але і асабліва па ўсіх якасных.

Расставіць адміністрацыйна тэхнічны пэрсанал па цэхах, вучастках, перакінуўшы з габінэтаў лешшыя адміністрацыйна тэхнічныя сілы, каб яны адказвалі матар'яльна за выкананьне пляну, за брак і нізкагатунковасьць.

Работаць поўным сем гадзін і ліквідаваць прастоі, даць браку імя і прозьвішча канкрэтных винаватых, ачысьціць прадпрыемства ад класавароважых, кулацкіх элемэнтаў, узначаліць маючыйся вялізарны творчы ўздым рабочых мас, яшчэ шырэй разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і ударніцтва- вось што будзе гарантыяй выкананьня прамфінпляну па ўсім колькасным і якасным паказчыкам. У нас няма і ня можа быць ніякіх аб'ектыўных прычын для невыкананьня прамфінпляну—кажа тав. Жураўлёў

* * *

Плян мы павінны выканаць і выканаем!

Указаньні сэкратара гаркому партыі, тав. Жураўлёва, зробленыя на нарадзе трыкутнікаў павінны быць зараз жа шырока абмяркованы на рабочых сходах. Кожны дырэктар, загадчык цэхам, вучасткам, брыгадзір павінен зараз жа распрацаваць апэрацыйны плян работы кожнага варштату, агрэгату, брыгады і цэху, выканаць пастанову ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК аб рабоце прамысловасьці, пастанову бюро ЦК аб становішчы віцебскай партыйнай арганізацыі.

Адказваць на пастановы партыі практычнымі справамі, поўным выкананьнем прамфінпляну па ўсіх яго паказальніках. Толькі такі адказ чакае пралетарская грамадзкасьць ад гаспадарчых, партыйных і прафэсыяльных кіраўнікоў фабрык і заводаў Віцебшчыны.

Перабудова тэхнічнага кіраўніцтва правяраецца рэальнымі справамі, процантамі і якасьцю выкананьня прамфінпляну.

Артыкул дырэктара завод „Чырвоны мэталіст" т. Краснова.

У газэце «Віцебскі пралетары» у № 176 ад 2 жніўня быў зьмешчан артыкул аб супраціўленьні з боку заводакіраўніцтва «Чырвоны мэталіст» у перабудове работы па тэхнічным кіраўніцтве заводу згодна пастановы ЦК УсеКП(б) аб рабоце вугальнага Данбасу і чыгуначнага транспарту.

Лічу, што газэта своечасова ўзьняла гэта пытаньне, што зьяўляецца зусім правільным. Старыя мэтады кіраўніцтва цэхамі, брыгадамі дрэнна адбіваліся на рабоце заводу. За ліпень месяц завод выканаў праграму ўсяго толькі на 73,9 проц, не хапала кваліфікаванай рабсілы 254 чал. Гэты недахоп завод папоўніў вучнямі, скончыўшымі ФЗВ мэталістаў. Маладых рабочых трэба было ня толькі расставіць, але і арганізаваць з імі працу так, каб яны ў самы найкарацейшы тэрмін асвоілі працэсы вытворчасьці, аўладалі б яе тэхнікай. Для гэтага патрэбны былі інжынэрна тэхнічныя сілы, якія сядзелі ў апарацэ, і ня толькі для гэтага, але таксама і для таго, каб паставіць правільна плянаваньне ў цэхах, наладзіць тэхнапёгічны працэс і вынішчыць той вялікі процант браку, які наш завод мае асабліва на ліцейным цэху.

Сваю памылку мы выправілі. З 1 жніўня перакінуты ў цэхі лепшыя тэхнікі—СЬЛІЎ—былы загадчык адделам вытворчасьці, прызначаны загадчыкам мэханіка зборачнага цэху. КАРАЎКІН—загадчык тэхнадёгічным працэсам—намесьнікам загадчыка ліцейнага цэху і рад іншых 3 21 ТЭХНІКАЎ, ПРАЦУЮЦЬ НЕПАСРЭДНА НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ 16.

Якія вынікі мы маем з гэтай работы? ТАКАРНЫ ЦЭХ, які адставаў галоўным чынам па весях да цялег, пагнаў завод у прарыў. Замест неабходных штодзённа 400 восей, цэх даваў штодзённа ня больш 300, а зараз ужо дае 415—425 у сярэднім Вучні ФЗВ у большасьці выкойваюць, а некаторыя нават і перавыконваюць нормы

ПА ЛІЦЕЙНЫМ ЦЭХУ брак, які ў чэрвені месяцы даходзіў да 26 проц., у ліпені—17 проц,—ужо ў першай дэкадзе жніўня дае 12 проц. Гэта ліцьба яшчэ вельмі вялікая. Патрэбна яшчэ многа працаваць над тым, каб зьнізіць да мінімуму процант браку па ліцейным цэху Такі вялікі процант браку здарыўся таму, што былы майстра ЖУРАЎСКІ, зараз зьняты, як камуніст і майстра, ня вёў барацьбу з бракаробамі і бракам, не інструктаваў фармаўшчыкоў Загадчык цэхам ГОРСКІ не арганізаваў тэхвучобу ў цэху, каб вучыць рабочых па аўладаньні тэхнікай фармоўкі. Горскі нават імкнуўся спасылацца на аб'ектыўныя прычыны, дакаціўся нават да размоў аб нерэальнасьці праграмы па карныя рэзцы.

Гэтыя адартуністычныя разважаньні атрымалі адпаведны адпор з боку грамадзкасьці заводу. Пры дапамозе інжынэра Фэльтмана ўдалося паменшыць процант браку з 26 да 12 проц

Трэба сказаць, што сярод інжынэрна тэхнічнага пэрсаналу ёсьць і такія, якія адмаўляюцца пайсьці ў цэх, разважаючы наступным чынам: «навошта мне ганіцца з расцэнкамі і мець справу з рабочымі ў цэху (Паўлаў)». Тэхнік БАСКІН, камуніст, ніяк ня можа згадзіцца з тым, што яго перакінулі ў цэх і ліквідавалі аддел рацыяналізацыі.

Пачатая рэарганізацыя яшчэ ня скончана, але тое, што мы маем ужо ў кожным цэху ня менш трох тэхнікаў, мае ўжо вялікае значэньне. У далейшай працы мы ставім перад кожным брыгадзірам, майстрам цэху і загадчыкам, пытаньне аб яго адказнасьці ў рабоце ня толькі маральна, але таксама і матар'яльна.

Кожны майстра, пастаўлены на тым ці іншым участку, павінен адчуваць сябе гаспадаром на сваім месцы, каб выканаць пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК аб рабоце прамысловасьці, у якой гаворыцца: „УЗМАЦНІЦЬ КАНТРОЛЬ ЗА ЯКАСЬЦЮ ПРАДУКЦЫІ Ў ВЫТВОРЧЫМ ПРАЦЭСЕ, УМАЦАВАЎШЫ АДКАЗНАСЬЦЬ УСЯГО ТЭХНІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ ЗА ДАПУШЧЭНЬНЕ БРАКУ І НІЗКАГАТУНКОВАЙ ПРАДУКЦЫІ, РАШУЧА ПРАВОДЗІЦЬ У ЖЫЦЬЦЁ МАТАР'ЯЛЬНУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ БРАКАРОБАЎ, ПРЫСТАСАВАЎШЫ СЫСТЭМУ ЗАРПЛАТЫ ДА СТЫМУЛЯВАНЬНЯ ВЫПУСКУ ДОБРАЯКАСНАЙ ПРАДУКЦЫІ (пастанова ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б—вось вакол чаго мы канцэнтруем увагу ў сваёй далейшай рабоце.

Бюро гарадзкога камітэту партыі, заслухаўшы даклад аб рабоце заводу, абавязала нас у жніўні—верасьні пакрыць запазычанасьць, якую завод мае за першае паўгодзьдзе. ГЭТУ МАГЧЫМАСЬЦЬ МЫ МАЕМ, АБ ЧЫМ СЬВЕДЧЫЦЬ РАБОТА ЗАВОДУ Ў ДРУГІМ КВАРТАЛЕ. Кожны рабочы, ударнік і ў першую чаргу камуніст і камсамолец павінны ўзяць на сябе канкрэтныя абавязкі па выкананьні гэтай дырэктывы.

АД РЭДАКЦЫІ.

Работа заводу за першую дэкаду жніўня, выкананьне праграмы на 85% гаворыць аб тым, што перабудова на заводзе пакуль што не адчуваецца на справе, на выкананьні прамфінпляну. Цэнтральны камітэт УсеКП(б) у сваёй пастанове аб рабоце вугальнага Данбасу і чыгуначнага транспарту папярэдзіў усіх кіраўнікоў, што толькі па рэальнай справе ЦК будзе разглядаць даць здольнасьць таго альбо іншага кіраўніка змагацца за генэральную лінію партыі, што толькі ад рэзультатаў работы таго альбо іншага заводу, чыгункі і шахты будзе разглядацца сапраўднасьць перабудовы работы па тэхнічным кіраўніцтве прадпрыемствам. Гэтага ў рабоце заводу мы пакуль што ня маем. Трыкутнік заводу павінен зараз-жа ўжываць усе захады да таго, каб не на словах, а на справе ўзяцца за ліквідацыю тых „вузкіх" месц, якія маюцца на заводзе (ліцейны цэх), і сапраўды дабіцца поўнай і своечасовай рэалізацыі апошняй пастановы гаркому

Мала ведаць прычыны прарыву, трэба забясьпечыць іх неадкладнае зьнішчэньне.

Артыкул дырэктара абутковай фабрыкі імя Лекерта т. Хайкіна.

Віцебская абутковая фабрыка імя Лекерта зьяўляецца адной з буйнейшых фабрык Белскуртрэста. На яе долю падае 28 проц. выпрацоўкі прадукцыі па трэсьце. За першае паўгодзьдзе 1933 года фабрыка не дадала 91.323 пары абутку, альбо 20,9 проц. праграмы. У цэнасным выражэньні—плян недавыканан на 22,6 проц.

Ня лепш справа і з якасьцю выпускаемай прадукцыі. Замест абутку першага гатунку—90 проц., фабрыка выпускае толькі 71,1 проц.

Адстае ад пляну і прадукцыйнасьць працы. У натуры плян выкананы на 84,2 проц., у цэнасным выражэньні на 82,2 проц.

Ня выканалі мы таксама запраэктаванае плянам зьніжэньне сабекошту Замест зьніжэньня на 3,54 проц, мы маем павялічэньне на 2,2 проц.

ТАКОЕ ГАНЕБНАЕ АДСТАВАНЬНЕ ФАБРЫКІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ВЫНІКАМ НЕПАЛАДАК УНУТРЫФАБРЫЧНАГА ХАРАКТАРУ. Да апошняга часу тэхкіраўніцтва цэхамі, вытворчасьцю пастаўлена з рук вон дрэнна. Ня было сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за якасьць выпускаемай прадукцыі з боку большасьці адміністрацыйна тэхнічнага пэрсаналу. Партыйная арганізацыя фабрыкі, як гэта выявілася ў час чысткі, была засьмечана чужымі элемэнтамі, выхадцамі з дробнабуржуазных нацыяналістычных партый, якія прынесьлі з сабою ўсе звычкі дробнабуржуазнай распусьнічанасьці, разгільдзяйства (ГУРЭВІЧ, ДЗЕГЦЯР, ПЕСКІН і інш.).

Гэтыя недахопы яшчэ больш пагыбляліся НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ ПАСТАНОЎКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў ЦЭХАХ Да апошняга часу адсутнічаў індывідуальны вучот бракаробаў, недавальняюча працуе і апарат па снабжэньні.

З боку пастаўшчыкоў былі таксама тармазы ў рабоце фабрыкі. Якасьць пастаўляемай сыравіны часта зрывала бесьперабойную работу фабрыкі. Напрыклад, Віцебскі скурзавод на працягу доўгага часу снабжаў фабрыку палуваламі, нагодным для рантавых сьцелек. Менскі завод «Бальшавік» даваў ўвесь час хром паніжанай супроць дагавору, гатункоасьці.

З-за адсутнасьці на фабрыцы лябараторыі, хэмікаты і сурагаты, атрымоўваемыя фабрыкай, пусталіся ў работу і давалі вялікія партыі нізкагатунковага абутку.

За апошні час у сувязі з правядзімай чысткай, а таксама з пачаткам перабудовы сваёй работы на аснове пастаноў ЦК УсеКП(б) аб рабоце Данбаса і чыгункі, актыўнасьць рабочых, ІТР значна ўзрасла.

Вінтавы цэх, быўшы да гэтага часу ў глыбокім прарыве, пачынае набіраць тэмпы, выканаўшы ліпеньскую праграму на 99,3 проц.

Рантавы цэх, кіраўніцтва якога было асабліва засьмечана „шляпамі" з партбілетам у кішэні, панікёрамі, выканаў прамфінплян толькі на 89,5 %.

Да гэтага часу якасьць прадукцыі застаецца ганебнай плямай для фабрыкі. Замест 90 проц. першага гатунку—фабрыка працягвае ў ліпені месяцы даваць толькі 76,3 проц.

Толькі ў апошні час мы пачалі перабудоўваць работу па тэхнічным кіраўніцтве фабрыкі і пераводзім на непасрэдную працу ў цэхі інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу.

Для апэрацыйнага тэхнічнага кіраўніцтва фабрыкі ў якасьці тэхнарука, трэст вылучыў вопытнага абутніка т. ДЫЦМАНА, а для забясьпячэньня бесьперабойнай работы машын і абсталяваньня—ў якасьці кіраўніка мантажнага цэха—т. Ставажэнку. Гэтыя таварышы ўжо прыступілі да працы.

Зьмешана кіраўніцтва аддзелу тэхнічнага кантролю, а таксама рантавага цэха Частка інжынэрна-тэхнічных работнікаў з габінэту пераведзена ў цэхі і прымацаваны да самых адказных працэсаў, ад якіх залежыць якасьць выпускаемай прадукцыі.

Ліпеньскі пленум ЦК і ЦКК паставіў перад намі адну з адказьнейшых задач—пакрыць запазычанасьць першага паўгодзьдзя. Наша фабрыка мае ўсе магчымасьці гэта выканаць. Патрэбна толькі, не пакладаючы рук, працаваць над тым, каб ажыцьцяўляючы непасрэднае кіраўніцтва ў цэху, правяраючы штодзённа, штогадзінна выкананьне заданьня як па колькасных, таксама і па якасных паказальніках, мабілізоўваць рабочую масу, каб вывесьці нашу фабрыку з таго ганебнага становішча, у якім яна зараз знаходзіцца, і заняць месца ў першых радох лепшых прадпрыемстваў горада Віцебска.

АД РЭДАКЦЫІ:

З карэспандэнцыі т. ХАЙКІНА відаць, што кіраўніцтву фабрыкі вядомы прычыны дрэннай работы фабрыкі. Тав. Хайкін піша аб пачатку перабудовы тэхнічнага кіраўніцтва на фабрыцы. Аднак, за першую дэкаду жніўня, па фабрыцы імя Лекерта праграма выканана ўсяго на 63 проц., нізкагатунковасьць замест 10 проц., складае 25. Гэта гаворыць аб тым, што дырэкцыяй ПА СУТНАСЬЦІ на справе яшчэ НІЧОГА ня зроблена ў напрамку выкананьня дырэктыў партыі па сапраўднай перабудове сваёй работы, рэалізацыі пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК. Трыкутнік фабрыкі ня ўцяміў, што НЯ ТОЛЬКІ расстаноўкай людзей абмяжоўваецца справа перабудовы, а справа заключаецца ў КАРЭННАЙ перабудове ўсіх форм і мэтадаў работы, каб кожны дзень, кожную гадзіну быць у курсе, ведаць дзе „вузкае" месца, для таго, каб своечасова прыняць меры для выпраўленьня. На жаль, у рабоце фабрыкі імя Лекерта мы гэтага яшчэ ня маем, аб гэтым сьведчыць работа фабрыкі за першую дэкаду жніўня. Дрэнна таксама кіраўнікі фабрыкі змагаюцца за сапраўднае паляпшэньне рабочага забесьпячэньня. Далей такое становішча не цярпіма. Зараз жа прыняць неабходныя меры для САПРАЎДНАГА зьнішчэньня недахопаў у рабоце фабрыкі, каб у жніўні выканаць плян на 100 проц. як па колькасных, так і па якасных паказальніках, што будзе доказам сапраўднай перабудовы работы фабрыкі.

РАСТУЦЬ ГІГАНТЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ІНДУСТРЫІ.



ПРАЦЯГ ПРАМОВЫ Тав. В. Ю. ЖАЬРОЎСКАГА.

Акружым настаўніка клопатамі і дапамогай.

ЦК КП(б)Б у пастанове аб школе абавязаў Наркамасьветы, ЦП саюзу працаасьветы і райкомы КП(б)Б наладзіць сыстэматычную дапамогу гэтым маладым пэдагогам. Гэта пастанова выконваецца недавычай дрэнна. Не выпадкова таму карэнны недахоп у начнай частцы школ дае сабе асаблівае адчуваць, бо гэтым карэнным недахопам хварэе частка нашых настаўнікаў і будуць працягваць хварэць гэтым, калі да іх ня прыйсьці на дапамогу.

Я хачу папярэдзіць Наркамасьветы, ЦП саюзу працасьветы і райкомы КП(б)Б, што ЦК КП(б)Б ня будзе цярпець гэта правальваньне перападных тоўкі настаўнікаў.

Апрача таго, трэба паставіць пытаньне і аб культурным абслугоўваньні настаўнікаў. У нас настаўнікі часта гаворыць не атрымліваюць, не гавораць ужо аб журналах, патрэбных настаўніку, якія дапамагаюць яго палітычнаму росту і ўздыму пэдагагічнай кваліфікацыі.

Бібліятэк для школьных работнікаў, якія-б дапамагалі ўсвоіць тэхніку школьнай работы няма, таксама няма мас ва-палітычных бібліятэк па пытаньнях тэхнікі. А такія бібліятэкі павінны быць для настаўнікаў.

Разам з тым Наркамасьветы патрэбна вывучыць і рэарганізаваць пэдагагічную практыку студэнтаў пэдагагічных тэхнікумаў і пэд. ВНУ, маючы на ўвазе неабходнасьць падрыхтоўкі такіх пэдагагічных кадраў, якія прыступаючы да практычнай работы, маючы патрэбную агульна-адукацыйную палітычную падрыхтоўку, у той жа час былі-б ужо ўзброены пэдагагічным майстэрствам.

У галіне снабжэньня настаўніцтва мы ў гарадох маем некаторы зрух. Снабжэньне сельскага настаўніка, адна, пастаўлена яшчэ слаба. І гэтага далей цярпець нельга.

Тут мы маем вялізарную інэртнасьць нашага савецкага апарату. У радзе месц дырэктывы партыі па гэтым пытаньні ігнаруюцца. Бюракратычна проста шкодзяць па гэтай лініі. Мы з тых харчовых рэсурсаў, якія маем, даём максымум магчымага на справу забесьпячэньня нашых настаўнікаў. Але мы маем рад фактаў, калі тое, што мы адпускаем настаўнікам, не доходзіць да апошніх. Напрыклад, у Рэвяніцкім сельсавеце, Чэрвеньскага раёну настаўнікі на працягу двух месяцаў не забясьпечваюцца хлебам. Паводле распараджэньня райснабу, спынена за бесьпячэньне хлебам за невыкананьне памольнага збору Тое-ж самае нагляда даецца і ў Старобінскім раёне. Калі інструктар ЦК гаварыў з культпропам райкому т. Нахмуновічам аб неабходнасьці забесьпячэньня настаўнікаў, то т Нахмуновіч заяўляе, што большасьць настаўнікаў—сялане, няхай прывязуць з дому сваю вопратку і няхай карыстаюцца рынкам.

Трэба біць па такіх гора-кіраўнікох. Некаторыя райкомы КП(б Б, У ПРЫВАТНАСЬЦІ, ВІЦЕБСКІ, з прыходам новага кіраўніцтва пачынаюць моцна правяраць работу сельсаветаў у гэтай справе, а вы, работнікі райАНА, калі вам не дапамагае райком партыі, не дапамагае РВК, стаўце пытаньне перад ЦК партыі, і мы вам заўсёды дапаможам у вашых законных, спраўдзілівых патрабаваньнях.

Вельмі нездавальняючай зьяўляецца работа камсамолу ў галіне школьнага будаўніцтва. Тая дапамога, якая аказваецца камсамолам школе, зусім не выстарчальна. Сярод настаўніцтва-жвялікі процант камсамольцаў. Наводле даных 27 раёнаў камсамольцы складаюць 36 проц. (Голас: па некаторых раёнах—да 75 проц.).

Пытаньні кіраўніцтва піянэрарганізацыямі ў школе павінны стаяць у цэнтры ўвагі камсамолу Трэба ў рабоце нашых школ павысіць ролю дзіцячага доктара і ролю пэда ёга. Дзіцячы доктар, пэдалёг у школе павінен заняць такое месца, якое яму па праве належыць. Ён павінен быць ня толькі кансультантам, але і арганізатарам у школе.

Пытаньні падрыхтоўкі школьных памяшканьняў — рамонт, пашырэньне школьных плошчаў, скончэньне новага будаўніцтва—маюць выключную вострасьць у падрыхтоўцы да наваучальнага году. Партыйныя, савецкія арганізацыі, камсамол павінны ўсьвядоміць сабе тую найвялікшую адказнасьць, якая ляжыць на іх па падрыхтоўцы школьных памяшканьняў да навучальнага году.

Наркамасьветы павінен мабілізаваць свой апарат на правядзеньне гэтай работы, трэба самым рашучым чынам рэагаваць на выпадкі безадказных, надбайна злачынных адносін да справы падрыхтоўкі школьных памяшканьняў.

Трэба своечасова забясьпечыць школу атрамантам, сшыткамі, алоўкамі, картамі, глёбусамі і інш. навучальнымі дапаможнікамі, без чаго настаўнік ня можа працаваць.

Вельмі неабходна прыступіць да стварэньня ў школах дзіцячых бібліятэк. Тут Наркамасьветы і арганізацыі савецкіх пісьменьнікаў трэба практычна на гэтыя пытаньні абмеркаваць і рэалізаваць—што мы можам даць дзецям з дзіцячай літаратуры на месцы, што перакладзіці і г. д.

Вакол усіх гэтых пытаньняў школьнага будаўніцтва трэба мабілізаваць увагу нашай рабочай грамадзкасьці, калгасьнікаў. Нам патрэбна не эпізадычная сувязь прадпрыемства, саўгаса, калгасу са школай. Трэба па сапраўднаму паставіць шэфства прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў над школай, якое (шэфства) у нас яшчэ неладжана.

У аснове практычнай работы гэтага шэфства павінны стаяць пытаньні—праверка, кантроль з боку рабочай грамадзкасьці стану работы школы і аказаньне канкрэтнай дапамогі.

Разам з тым трэба шырока мабілізаваць рабочую грамадзкасьць на барацьбу за пастаноўку камуністычнага выхаваньня ў школе, на барацьбу супроць усякіх клясава-варожых вылазак, у якой-бы форме я

НАВЯДЗЕМ БАЛЬШАВІЦКІ ПАРАДАН У ЖАКТАХ.

Справа агляду работы жактаў—справа усей пралетарскай грамадзкасьці Віцебска.

ЗА ЦЬВЕРДУЮ КЛЯСАВУЮ ЛІНІЮ У РАБОЦЕ ЖАКТАЎ!

КОЖНЫ ЖАКТ, КОЖНЫ ФАБЗАЎКОМ ПАВІНЕН СЁНЬНЯ-ЖА ЎКЛЮЧЫЦЦА Ў АГЛЯД!

ЖАКТ № 1,

ТРЭБА, НАРЭШЦЕ, ЗРАБІЦЬ РАМОНТ!

У ЖАКЦЕ № 1 існуе рад згіднасьцяй, безгаспадарчасьць у справе правядзеньня рамонту. Вось. прыкладна, дом № 5, па вул. Фрунзе, прыналежны ЖАКТ'у. Там патрабуецца рамонт лесьвіц, уборнай, памойнай. Аднак, праўленьне ЖАКТ'а ніякіх мер па прымае. Старшыня-ж ЖАКТ'у Сьпецэвіч не сачыць за тым, каб вытварыць рамонт.

Яшчэ патрабуецца рамонт дзьвярэй: дзьверы ўсе ў шчылінах, трэба чыніць рамы ў вокнах. Час ідзе, насоўваецца зіма—да рамонту яшчэ ня прыступілі.

А праўленьне ЖАКТ'у—нярухома.

Ш. ВАХЦЕРАЎ.

ЖАКТ № 10.

ЕЎДАКІМАВУ ТРЭБА ВЫГНАЦЬ ВОН З ПРАЎЛЕНЬНЯ!

У ЖАКЦЕ № 10 па вуліцы Талстога 8, звольнілася кватэра.

Высхаў жыхар Сенчанка. Замест таго, каб гэту кватэру прадаставіць пад школу, старшыня ЖАКТ'у т. ЕЎДАКІМАВА забірае яе сабе і бяз ведама праўленьня ЖАКТ'у і гаржылсаюзу ўсяляецца сама. На заўвагі жыхароў, што так рабіць нельга, адказвае: „Што? Я старшыня і маю поўнае права гэта рабіць". І сапраўды, Еўдакімава пачала рабіць унутраны рамонт сваёй новай кватэры ў той час, як патрэбна рамантаваць дахі. У дадатак яна адрывае плотнікаў ад работы па рамонце дахаў Жактаўскіх будынкаў.

Лічу, што такім злодзеям, як Еўдакімава, якія зрываюць падрыхтоўку да навучальнага году, якія займаюцца самаснабжэньнем і замест рамонту рабочых кватэр—рамантуюць сваёвя месца ў нашых ЖАКТ'ах.

МІХАЛЕВІЧ.

ЖАКТ № 33.

БЯЗЬЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ ВЕСЬЦІ З РАСХІШЧЭНЬНЕМ ГРАМАДЗКАЙ УЛАСНАСЬЦІ.

Старшыні жакту № 33 Грачухіну даручылі ключы ад складу будматар'ялаў. Здавалася, што Грачухін павінен быў гэты склад берагчы, даражыць будматар'ялямі, якія прадназначаны для рамонту жактаўскіх дамоў. Аднак, Грачухін пачаў браць гэтыя будматар'ялы і паліць іх у сваёй кватэры на дровы.

Пастановай праўленьня жакту, ГРАЧУХІН зьнят з пасады старшыні жакту і прыцягнут да судовай адказнасьці.

АД РЭДАКЦЫІ:

Лічым, што Грачухіну ня месца і на АДКАЗНАЙ рабоце ў МК вагонных майстэрняў МЕБ, дзе ён зараз працуе

ПРОЦІ „РЭКОРДСМЭНСТВА", ЗА ЯКАСЬЦЬ!

За бальшавіцкія тэмпы і якасьць уборкі і абмалоту!

ПАГОНЯ ЗА „РЭКОРДАМІ" ПАДМЯНІЛА БАРАЦЬБУ ЗА ЯКАСЬЦЬ.

ПРАЎЛЕНЬНЕ КАЛГАСУ ІМЯ ЧАРВЯКОВА ПАСТАВІЛА САБЕ МЭТАЙ ВЫКАНАЦЬ У ЖНІЎНІ ЦАЛКАМ УВЕСЬ ГАДАВЫ ПЛЯН ПАСТАВАК ЗБОЖЖА І ЎСІХ БУЛЬТУР. Пачалася гонка процантаў, замест барацьбы за якасьць, замест неадрыўнага злучэньня барацьбы за якасьць з барацьбой за бальшавіцкія тэмпы. Малатарня, якая працавала на электрычным маторы, была пераключана з-за таго, што па тух сьвет на трактарный цяге. У сьнопцы, ў вялізарным таку, малацілі амаль у пацёмках толькі пры двух ліхтарах, замест таго, каб мабілізаваць адпаведную колькасьць ліхтараў, забясьпечыць правільную расстаноўку сіл.

Жыта падвозілі МАЛЕНЬКІЯ ХЛАПЧУКІ, якія гублялі па дарозе снапы. Снапы ў пацёмках вгружаліся ў ток, кідаліся абяяк, зярно з іх высыпалася і амаль у абсалютнай цемры падавалася у барабаны. У рэзультаце, не заўважаным прайшоў той факт, што жыта малацілі вільготнае, не прасушанае, а мяківа з застаўшымся ў ёй каля 60 пудоў збожжа, прама выкідвалася за ток, папала пад дождж і згніла.

Ня дзіва, што змалочанае жыта, якое мела вільгаці больш 22 проц. у колькасьці 40,73 цэнтн., было адпраўлена назад і ня прынята ў лік збожжапаставак. У частцы кіраўнікоў калгасу пануе шкодная тэндэнцыя: „Што-ж, жыта ня прынялі. Пасеем яго, хоць і вільготнае, але ўзойдзе". Гэтая шкодная ўстаноўка сеяць недобраякасным насеньнем актыўна падтрымліваецца брыгадзірам цэнтральнай брыгады БАБРОВЫМ, кладаўшчыкамі ПРУСАКОВЫМ і БРЫКМАНАМ.

Барацьба са стратамі збожжа—забыты вучастак работы. Калясы не падбіраюцца.

Такое-ж становішча і ў радзе іншых калгасаў сельсавету. Калгас „Чырвоная армія" чатыры разы вазіў жыта на пункт і яго зварочвалі назад з-за недобраякасьці. Тое-ж самае і ў калгасе „Іскра".

У калгасе «1 мая» на палёх была злоўлена група вычышчаных з калгасу кулакоў, якія падграбалі калосьсі пасьля жніва.

Гэтыя факты яскрава пацьвярджаюць усю сваячасовасьць сыгналаў ЦО «Праўды» і тэлеграму тт Гікало і Галадзеда, гэтыя факты яскрава пацьвярджаюць як шкодна захапленьне „рэкордамі" у ўшчэрб барацьбе за якасьць.

Нам патрэбна баявая бальшавіцкая арганізаванасьць, бальшавіцкія тэмпы ўборкі і збожжаздачы, неадрыўна зьвязаныя, памножаныя на высокую якасьць уборкі і збожжапаставак дзяржаве. Р.

На малацьбу—лепшых праверaных калгасьнікаў.

У зрыве малацьбы вінавата не складаная малатарня, а складаныя кулацкія хітрыкі.

Кіраўніцтва калгасу «Культурны фронт», Вяліка-Лётчанскага сельсавету, груба ігнаруе дырэктывы партыі і ўрада аб праверцы людзей, якім даручаецца такая адказная работа, як абмалот збожжа.

Калгас засьмечан кулацкімі элемэнтамі, чаго не адмаўляе і сам старшыня калгасу Тышэвіч. Але-ж добра ведаючы гэта, Тышэвіч дапусьціў групу сабатажнікаў—былых цьвёрдазаданьнікаў, як МІСЮКОВА Восіпа, БУТКЕВІЧА Базыля, МАРЧАНКА Базыля і інш. да барабана поўскладанай малатарні для падачы жыта. А ім толькі гэта і было патрэбна. Прабраўшыся на гэты адказьнейшы вучастак работы малатарні, яны разгарнулі на ім сваю кулацкую шкодніцкую работу, якая выразілася ў наўмысным нароўнамернай падачы ў барабан жыта (цэлымі снапамі). Гэтым самым шкоднікі заглушалі матор, выклікаючы частыя і працяглыя прастоі малатарні. Кулацкая мэта была накіравана на зрыў сваячасовай здачы дзяржаве збожжа і разам з тым, на кампрамэтацыю поўскладу наймала тарні.

Такая антысавецкая работа праводзілася на вачох прымапаванага да брыгады па малацьбе брыгадзіра гаркому—члена партыі т. ФЭЙГІНА, загадчыка вучасткам МТС—члена партыі тав. Аверка і самаго старшыні калгасу Тышэвіча. Замест таго, каб правяць клясавую пільнасьць і даць рашучы сакрушальны адпор кулацкім махінацыям, яны заняліся складаньнем нікому не патрэбных актаў аб прастоях машын і іх няспраўнасьці.

Гэта кулацкая вылазка і страта клясавага пачуцьця ў паказаных асоб, вы яўлены толькі дзякуючы ўмяшацельству кантрольнай камісіі. Факт кулацкага сабатажу бясспрэчны, бо калі да барабана стаў старшы мэханік МТС тав. Гаравенка і пачаў роўнамерна падаваць жыта, малатарня работала без перабояў.

У рашэньні прэзыдыуму КК РСІ па гэтых фактах антысавецкіх дзеяньняў, прапанавана МТС сумесна з парт'ячэйкай і сельсаветам на працягу трох дзён правесьці праверку складу брыгадзіраў, кладаўшчыкоў, выявіць кляса ва варожыя элемэнты з мэтай ачысткі ад іх праз сходы лепшых калгасьнікаў-ударнікаў.

Прэзыдыум КК-РСІ даў рашучую бальшавіцкую ацэнку кулацкай вылазцы і прымірэнчым адносінам да яе, папярэдзіўшы тт Фэйгіна, Аверка, Гаравенка і Тышэвіча, што калі з іх боку ня будуць у самым хуткім часе выпраўлены дапушчаныя памылкі, ня будзе забясьпечан сваячасовы абмалот і першачарговая высокаякасная здача збожжа дзяржаве, засыпка насеньфондаў, сваячасовая сяўба азіміны і інш.,—яны будуць прыцягнуты да самай суровай партыйнай і суповай адказнасьці.

Адказнасьць за бесьперабойную работу малатарні павінна быць узмоцнена.

Вастрэй рэвалюцыйную пільнасьць на кожным вучастку работы!

ЖЫЦЕЛЬЗЭЙФ.

СТРАТЫ ДАХОДЗЯЦЬ ДА 5 ПУДОЎ З ГА.

У калгасе імя Чарвякова, Віцебскага сельсавету стряты дасягаюць проста жахлівых памераў амаль на ўсіх вучастках уборкі.

Больш 20 га да 15 жніўня ва ўсіх брыгадах стаяла на корані, у той час, калі мелася поўная магчымасьць убраць іх куды раней.

А ў брыгадзе ПАПЯЛКОВА ў гэты-ж час пачалося масавае паломэніцтва жанчын з малаком у горад і брыгадзір дайшла да таго, што жанчыны раней 2 гадзін ня выходзілі на работу. «Штатная» прагульшчыца Лапунова дапускалася Папялковым да работы назад і ў 4 гадз. дню.

Ня гледзячы на тое, што ў растараджэньні Папялкова мелася дзьве жнівяркі,—адна, як правіла ніколі не скарыстоўвалася, а другая больш 7 гадзін у суткі не працавала. А жыта, якое брыгадзір меў усе магчымасьці ўбраць раней і бяз страт, асыпалася і не адна тысяча раскіданых па полі зёрен была рэзультатам кулацкай бестурботнасьці Папялкова. І ў давяршэньне ўсіх агіднасьцяй, па яго загаду з усіх жнівярак былі зьняты зернаўлавіцелі «з за непатрэбнасьці». А на самай справе зерначуляўлавіцелі былі поўны зярна. Брыгада такім чынам страціла каля 40 пудоў збожжа.

У брыгадзе пасьля жніва, калосьсі амаль не падграбаліся. Рэзультат—страты дасягнуўшыя больш 5 пудоў з га. Такім чынам пры далейшым папусьціцельстве з 75 га ячменю не дабяруць каля 375 пудоў зярна і працадзень калгасьніка рэзка зьменшыцца.

Праўленьне калгасу на чале са старшынёй т. Острым, парт'ячэйка на чале з тав. Шахметавым фіксавалі факты, прымяркоўныя з гэтым ганебным становішчам.

І ў працэсе перавозкі ад поля да току застаецца не адзін абронены колас.

У другой брыгадзе да самага апошняга часу ў фурманкі чічога не пасьцілалася. І ня рэдка ўначы ля току можна назіраць пры тусклым сьвеце ліхтара цэлыя кучы калосьсяў, сыпаючыхся з-пад вазоў.

Застаецца шмат зярна ў мякіне, якое не правейваецца, а на сартыровачным пункце праз гнілы мост асыпаецца шмат зярна.

12 жніўня, пры ўскрыцьці маста знойдзены два пуды ўжо загніўшага збожжа.

За апошні час праведзен цэлы рад практычных мерапрыемстваў, маючых на мэце канчаткова дабіць страты.

Ва ўсіх брыгадах калгасу абраны камісіі па якасьці.

Страты пры ўборцы, на малацьбе, возцы збожжа з поля—ёсьць вынік нездаровай сьпешкі, мітусьні, ёсьць вынік бесталочы і пагоні за „рэкордамі" замест бальшавіцкай арганізаванасьці, што прыводзіць да буйных страт, што грае на руку кулаку.

Калі б раней праўленьне калгасу па бальшавіцку арганізавала б работу усіх жнівярак з зернаўлавіцелямі, давілася б 100 процантнага выхаду калгасьнікаў на работу і высокай дысцыпліны, то не прышлося-б «наганяць упушчанае» нездаровай сьпешкай і мітусьнёй, якая прывяла калгас да жахлівых памераў страт.

С. Раскін, Я. Лаўр'е.

ЗАГРАНІЦАЙ.

Другі інтэрнацыянал працягвае руку фашызму.

ПАРЫЖ. 21 жніўня раніцай у Парыжы адкрылася канфэрэнцыя II інтэрнацыяналу. На першым пасяджэньні выступілі сацыял-фашысцкія лідэры ФРЫЦ АДЛЕР, ЛЕОН БЛЮМ І ВАН ДЭРВЭЛЬДЭ.

Пытаньні парадку дня—«Ваенная небясьпека», „Праблема адзінства рабочае клясы", „Праблема ўлады" і інш.—пастаўлены сацыял-фашысцкімі лідэрамі з адзінай мэтаю ДЭЗАРЫЕНТАВАЦЬ РАБОЧЫЯ МАСЫ, АБЯЗВРОЦЬ ІХ У БАРАЦЬБЕ СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКАЙ НЕБЯСЬПЕКІ, паралізаваць іх цягу да рэвалюцыйнага адзінага фронту.

Для характарыстыкі глыбіні фашысацыі II інтэрнацыяналу паказальна, што ў прад'езьдзаўскай дыскусіі афіцыйнае кіраўніцтва французкай сацыялістычнай партыі ўсякімі спосабамі ўнікала прамой палемікі з апазыцыяй Рэнаделя. Бачна, афіцыйнае кіраўніцтва намерана ўхіліцца на канфэрэнцыі ад спрэчак з Рэнаделем і яго прыхільнікамі, каб ня выкрыць у міжнародным маштабе, што ўсе разнагалосьсі зводзяцца па сутнасьці ДА ПЫТАНЬНЯ АБ ТЭМПАХ ФАШЫЗАЦЫІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ.

Рачам з гэтым, зусім ясна ўжо зараз што лідэры II інтэрнацыяналу, у першую чаргу французскага сацыял-фашызму, пастараюцца зьняць з сябе адказнасьць за ганебны крах міжнароднай сацыял-дэмакратыі у сувязі з капітуляцыяй германскай сацыял-дэмакратыі перад фашызмам. Яны імкнуцца ўтаіць ад рабочых мас той факт, што ТАКТЫКА II ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ НІКОЛІ НІЧЫМ НЕ АДРОЗЬНІВАЛАСЯ І ЦЯПЕР НЕ АДРОЗЬНІВАЕЦЦА АД ТАКТЫКІ ГЕРМАНСКАЙ САЦЫЯЛ ДЭМАКРАТЫІ, ЯКАЯ РАСЧЫСЬЦІЛА ШЛЯХ ДЛЯ ФАШЫЗМУ.

Уся антыфашысцкая дэмагогія сацыял фашысцкіх лідэраў па сутнасьці зводзіцца ДА АБАРОНЫ БУРЖУАЗНАЙ ДЭМАКРАТЫІ. У адпаведнасьці з гэтым, знаходзіцца імкненьне сацыял фашысцкіх лідэраў усякімі спосабамі затушаваць клясавую прыроду фашызму. Так, БЛЮМ нядаўна абвясьціў фашызм „прамежным этапам паміж капіталізмам і сацыялізмам".

Уся дзейнасьць прахадзячай канфэрэнцыі будзе больш чым калі бы там ні было падпарадкавана асноўнай задачы—ЗАТАРМАЗІЦЬ УЗДЫМ НОВАЙ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ХВАЛІ, ПЕРАШКОДЗІЦЬ БАРАЦЬБЕ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ СУПРОЦЬ КАПІТАЛІЗМУ, ВАЕННАЙ НЕБЯСЬПЕКІ І ФАШЫЗМУ.

Гатовы ўмяшацца ў Аўстра-Германскі канфлікт.

ПАРЫЖ. Парыскія газэты лічаць ня пэўным, каб Мусаліні меў посьпех ва узятай ім на сябе ролі АРБІТРА У АЎСТРА-ГЕРМАНСКІМ КАНФЛІКЦЕ. Алначасна газэты ў рашучым тоне нагадваюць аб намерах Францыі право дзіць цьвёрдую палітыку недапушчэньня аншлюса (далучэньня Аўстрыі да Германіі). Па словах „Тан", Францыя і Англія у сучасны момант вывучаюць пытаньне аб магчымасьці хуткай дапамогі Аўстрыі шляхам прадастаўленьня ёй мытных ільгот. Газэта адзначае, што Францыя і Англія гатовы ў патрэбны момант умяшацца ў Аўстра-Германскі канфлікт.

Новыя спробы сарваць перагаворы аб КУЧ.

ТОКІЁ. Газэта „І